Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
11 ЛЮТАГА 2017 г. СУБОТА № 29 (28393)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Што паглядзець замежніку ў Беларусі?**
СТАР. 4



**Школьныя паборы: за і супраць**
СТАР. 5



**Як ловяць «начных матылькоў»**
СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксей АЎРАМЕНКА, першы намеснік міністра транспарту і камунікацый:**

*«Пытанне аб увядзенні платы за карыстанне аўтамабільнымі дарогамі для беларускіх уладальнікаў легкавых аўтамабіляў не разглядаецца, мы не плануем гэта рабіць. Таксама хачу сказаць аб выдаткоўванні сродкаў ад збірання дарожнага збору (летась яго сума склала $140 млн). Дзяржаўная пошліна размяркоўваецца і накіроўваецца на будаўніцтва, капітальны і бягучы рамонт рэспубліканскіх аўтадарог. У далейшым метад размеркавання дзяржпошліны можа быць удасканалены. Варта задумацца ў перспектыве аб размеркаванні пошлін у мясцовай дарожнай гаспадарцы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.02.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9028 ▼ |
| Еўра | 2,0260 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0323 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0698 ▼ |

ISSN 1990 - 763X
17029>
9 771990 763008

# ЗНАЙДЗІЦЕ РОЗНІЦУ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінскі інжынер-наладчык медыцынскіх лазерных апаратаў Андрэй НЕСЦЕРАЎ ужо болей за дзесяць гадоў захапляецца вывучэннем паводзін рэдкіх птушак, робіць іх здымкі. Для гэтага ён наведвае аддаленыя лясныя і балотныя біятопы краіны. Гэтым разам аматар-арнітолаг у ваколіцах заказніка Ельня прывабіў вераб'інага сыча — прадстаўніка самага маленькага віду савіных, які занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Для гэтага знаёмай майстрыхай быў выраблены — з воўны — штучны сычык. Дарэчы, на здымках вы бачыце іх абодвух. Знайдзіце розніцу!

■ Круглы стол

# ШТО БАЛІЦЬ ПАСЛЯ 60?

**Вось ён, сярэднестатыстычны мужчына «60 з плюсам», перажывае з-за таго, колькі яшчэ будзе працаваць, а здароўе ўжо, як правіла, дало збой, даводзіцца пайсці па ўрачах і атрымаць некалькі дыягназаў, працяглы пералік медыкаментаў і, безумоўна, моцны стрэс. Штосьці з пераліку пацыент пачынае прымаць, з'яўляюцца пабочныя эфекты, псіхалагічны стан пагаршаецца аж да дэпрэсіі, і аднойчы — здароў, востры каранарны сіндром, інфаркт міякарда. Вывад? Не чакайце нейкай узроставай мяжы, каб заняцца здароўем. Ёсць хранічныя захворванні — шукайце ўрача-каардынатара, які будзе раіцца з вузкімі спецыялістамі, каб вы атрымалі як мага менш пабочных эфектаў ад лячэння. У ідэале такім спецыялістам стане ўрач агульнай практыкі.**

СТАР. 6–7




Фота Надзеі БУЖАН.

■ Дэкрэт №3

# Хто даказаў, што ён не ўтрыманец?

**Цяжарныя, выпускнікі і беларусы, якія ў 2015-м знаходзіліся за межамі краіны**

**У спісах утрыманцаў апынулася шмат нечаканых людзей. Пра адных «забыліся» асобныя арганізацыі, не ўключыўшы іх у свае шэрагі. Іншых паспяшаліся прылічыць да абавязаных плаціць збор на фінансаванне дзяржаўных расходаў, бо на працу яны не ходзяць, а чаму — ніхто не разбіраўся. З 470 тысяч беларусаў, якія мусяць выплаціць дзяржаве грошы за ўтрыманскі лад жыцця, аддаць патрэбную суму пагадзіліся 44,5 тысячы чалавек, а гэта менш за 10%. Астатнія пакуль даказваюць, што нічога не вінны. Некаторым гэта ўдаецца.**

## Эмігрантка

— Шмат гадоў, жывучы ў Беларусі, я займалася пісьменніцкай дзейнасцю і супрацоўнічала з замежнымі рэдакцыямі. Падатковай інспекцыі я была нецікавая, бо падаткі за мяне выплачвалі мае партнёры з Расіі.

СТАР. 7

# ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА: АБАРОНА ІНТАРЭСАЎ КРАІНЫ І КОЖНАГА ГРАМАДЗЯНІНА

### Прэзідэнт патрабуе забяспечыць збалансаванае развіццё эканомікі краіны

**Сярод запрошаных на нараду, як паведаміла БЕЛТА, была невялікая група экспертаў, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў правядзенні сацыяльна-эканамічнай палітыкі ў Беларусі. «Гэта значыць з аднаго боку — людзі, якія сёння займаюцца эканомікай. З другога — якія займаліся эканомікай амаль што на гэтых жа пасадах учора, але да гэтага часу працуюць у той ці іншай эканамічнай структуры, і для якіх развіццё нашай краіны небыякава», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт расказаў, што апошнім часам атрымлівае вельмі шмат пісьмаў з розных крыніц, у якіх спецыялісты выказваюць сваю пазіцыю і пункт гледжання. «Часам крытычны адносна некаторых напрамкаў развіцця нашай эканомікі. Я адчуваю, што назбіралася некалькі такіх прапаноў, якія мы павінны сёння абмяркаваць, прытрымліваючыся прынцыпу адкрытасці размовы Прэзідэнта з рознымі слаямі насельніцтва», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, неабходна ў ходзе дыскусіі вызначыцца па далейшых дзеяннях, магчыма нестандартных, якія могуць надаць дадатковы імпульс беларускай эканоміцы.

У Беларусі ў пытанні фарміравання напрамкаў развіцця эканомікі і кіравання эканомікай паспрабавалі ўжо розныя метады і падыходы. «І на справе паспрабаваўшы, ведаем, да якіх наступстваў могуць прывесці тыя ці іншыя дзеянні, — сказаў Прэзідэнт. — Але ёсць добрая ад жыцця прымаўка, што ісціна недзе пасярэдзіне. Ёсць кансерватыўны шлях развіцця эканомікі. З іншага боку — ліберальны. У розныя перыяды мы сапраўды карысталіся рознымі метадамі і інструментамі развіцця эканомікі. Але, зыходзячы з таго, што ісціна пасярэдзіне, думаю, мы сёння зможам дамовіцца і знайсці нейкія кампрамісы».

«Нашу эканоміку трэба прараэвізаваць з пункту гледжання чалавечага фактару. Аднак важна, каб крокі, што прымаюцца, не стварылі перадумоў для дэстабілізацыі ў будучым, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Развіццё павінна быць абсалютна збалансаваным. Без валютных узрушэнняў, плацежных крызісаў і іншых негатыўных з'яў, якія мы перажывалі ўжо».

«Калі нехта разлічвае на маштабную эмісію, то маё патрабаванне абсалютна вядомае і заключаецца з сутнасці эканамічнага развіцця апошніх гадоў: пустых грошай друкаваць не будзем. Неабходна вырашаць усе пытанні ўласнымі сіламі за кошт правільнага эканамічнага рэгулявання і паляпшэння дзелавога клімату», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

У многіх удзельнікаў нарады ёсць прапановы аб задзейнічанні дадатковых крыніц эканамічнага росту. Кіраўнік дзяржавы прапанаваў іх абмеркаваць, але адначасова папярэдзіў аб недапушчальнасці адыходу ад генеральнай лініі развіцця дзяржавы і эканамічнай палітыкі. «Галоўны яе пастулат — сацыяльная справядлівасць, павышэнне ўзроўню жыцця людзей, абарона інтарэсаў краіны і кожнага грамадзяніна», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што цяперашняя нарада ў вузкім коле не падмяняе маючай адбыцца размовы на пашыраным пасяджэнні ўрада, якое павінна прайсці ў найбліжэйшы час. «Там мы паглядзім, як выконваецца план, які ўрад прапанаваў краіне і які зацверджаны Прэзідэнтам. Паглядзім, як гэты план выкананы за першы год пяцігодкі і якія задзелы створаны на будучае. Сёння мы павінны абмеркаваць нестандартныя меры і дзеянні, якія можам прыняць, каб палепшыць сітуацыю і паскорыць развіццё нашай эканомікі», — рэзюмаваў беларускі лідар.

■ Сацыяльны ракурс

# Дасягнуць 500 і пазбавіцца ад «ураўнілаўкі» ў зарплаце бюджэтнікаў

### Міністэрства працы і сацыяльнай абароны фарміруе палітыку ў сферы аплаты працы

**Дасягненне да канца 2017 года ўзроўню сярэднямесячнай заработнай платы ў памеры 500 долараў у эквіваленце назваў галоўнай задачай намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО на выніковай калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. «Такая задача пастаўлена кіраўніком дзяржавы і яе неабходна няўхільна выконваць», — адзначае віцэ-прэм'ер. Пры гэтым рост заработнай платы не павінен апярэджваць рост прадукцыйнасці працы, лічыць Васіль Жарко.**



Фота БЕЛТА.

Атрымліваць усім нам па пяцьсот долараў у эквіваленце да канца гэтага года рэальна, лічыць першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй Лабовіч. Дасягнуць гэтага, на яго думку, можна за кошт павышэння эфектыўнасці работы.

У рэальным сектары эканомікі ўвесь мінулы год праводзілася работа па забеспячэнні залежнасці ўзроўню зарплаты работнікаў ад эфектыўнасці дзейнасці прадпрыемства, а павышэння зарплаты — ад росту прадукцыйнасці працы. Рост заработнай платы работнікаў дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутным фондзе якіх доля ўласнасці дзяржавы складае больш за 50%, ажыццяўляўся толькі пры ўмове апераджальных тэмпаў росту прадукцыйнасці працы над тэмпам росту зарплаты. У выніку ў краіне суадносіны росту прадукцыйнасці працы і зарплаты пастаянна павялічваюцца, і за студзень—лістапад мінулага года яны склалі 1,056.

У Беларусі пастаянна расце колькасць арганізацый, якія прымяняюць гнуткія сістэмы аплаты працы. Адначасова ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны лічаць, што трэба даць больш свабоды ў пытаннях аплаты працы бюджэтнікаў. Пра гэта заявіў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй Лабовіч на выніковай калегіі міністэрства.

Павышэнне ўзроўню аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы ажыццяўляецца ў асноўным шляхам павелічэння памеру тарыфнай стаўкі першага разраду.

Разам з тым Міністэрства працы і сацабароны прапануе адысці ад цэнтралізаванага рэгулявання аплаты працы і даць больш свабоды кожнай канкрэтнай галіне, каб кіраўнікі бюджэтных арганізацый атрымалі магчымасць эфектыўна стымуляваць сваіх работнікаў, зыходзячы з прыярытэтаў сваёй галіны і вынікаў працы работнікаў. Адпаведныя прапановы міністэрства ўжо накіравала ва ўрад.

Акрамя таго, на думку Васіля Жарко, неабходна максімальна задзейнічаць унутраныя рэзервы бюджэтнай сферы, больш актыўна займацца аптымізацыяй яе функцыянавання, прыцягненнем пазабюджэтных даходаў. Напрыклад, як заявіў намеснік прэм'ер-міністра, нават пры наяўнасці эканоміі сродкаў не заўсёды ёсць магчымасць выкарыстоўваць гэты фактар для павышэння заработнай платы. Васіль Жарко паставіў задачу сумесна з Міністэрствам фінансаў, іншымі зацікаўленымі міністэрствамі распрацаваць нарматыўны прававы акт, каб выключыць тармажэнне ў гэтым пытанні і ўнесці праект дакумента на разгляд ва ўрад.

Што датычыцца неафіцыйнай працы і ўтойвання даходаў, то, на думку першага намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, у канчатковым выніку гэта ідзе не на карысць чалавеку. Такія людзі не маюць права на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, а значыць, пасля — і на працоўную пенсію, а таксама на абавязковае страхаванне ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, адзначае Андрэй Лабовіч.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■

■ Знешняя палітыка

# У цэнтры ўвагі дыпламатаў

### МЗС не драматызуе сітуацыю з пагранічнай зонай на мяжы Беларусі і Расіі

**Сітуацыя з увядзеннем Расіяй пагранічнай зоны на мяжы з нашай краінай пастаянна знаходзіцца ў полі ўвагі Міністэрства замежных спраў. Пра гэта паведаміў журналістам начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

«Сітуацыя з увядзеннем расійскім бокам пагранічнай зоны на тэрыторыі, прылеглай да Дзяржаўнай граніцы Беларусі, пастаянна знаходзіцца ў полі нашай увагі, — сказаў Дзмітрый МіронЧык. — Міністэрства адсочвае інфармацыю для своечасовага аказання беларускім грамадзянам неабходнай прававой дапамогі. З моманту дзеяння новых правілаў, што ўступілі ў сілу 7 лютага, якіх-небудзь сігналаў аб праблемных пытаннях ад нашых грамадзян не паступала, сітуацыя ў цэлым спакойная».

Прэс-сакратар звярнуў увагу, што МЗС Беларусі, вядома, прадоўжыць работу з расійскім бокам у гэтым кірунку і разлічвае на цеснае ўзаемадзеянне па лініі пагранічных службаў у частцы атрымання дэталёвых і вычарпальных тлумачэнняў.

«Яшчэ раз падкрэслю: на сённяшні дзень у межах беларускіх прыгранічных тэрыторый на граніцы з Расіяй у нас няма рэжымных зон», — заўважыў Дзмітрый Міронч ык.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

■ Ва ўрадзе

# Новыя парасткі эканомікі

### Прамысловасць краіны знаходзіцца на ўздыме, лічыць кіраўнік урада

**Эканамічная сітуацыя ў краіне ў гэтым годзе чакаецца значна лепшай, чым у мінулым. Такі прагноз пасля нарады ў кіраўніка дзяржавы па актуальных пытаннях развіцця эканомікі даў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ.**

«Да гэтага ёсць як унутраныя, так і знешнія перадумовы, — заявіў прэм'ер-міністр. — Я праглядаю сапраўды рэальныя пазітыўныя трэнды. Практычна ўсе галіны прамысловасці ўжо ў канцы мінулага года перавышалі аб'ёмы вытворчасці ўзроўню 2015 года».

Андрэй Кабякоў адзначыў, што крыху адставала дрэваапрацоўка, але і ў гэтай галіне адназначна назіралася тэндэнцыя на аднаўленне аб'ёмаў. «Я ўпэўнены, што гэта ўжо фактычна ў 2017 годзе адбудзецца. Былі праблемы ў нафтахімічнай галіны ў сувязі з вядомымі абмежаваннямі па пастаўках і аб'ёмах перапрацоўкі нафты. Усе астатнія — машынабудаванне, лёгкая, харчовая прамысловасць — знаходзяцца на ўздыме», — сказаў прэм'ер-міністр. Па папярэдняй статыстычнай інфармацыі, тэмпы росту прамысловай вытворчасці ў студзені гэтага года склалі 105,9% да ўзроўню студзеня 2016 года.

Што датычыцца дасягнення пастаўленай мэты па ўзроўні сярэдняй зарплаты ў краіне, кіраўнік урада падкрэсліў, што гэтая задача будзе вырашацца без разгону ўнутранага попыту эмісійным спосабам. «Гэта недапушчальна, і з гэтым пагадзіліся ўсе ўдзельнікі нарады. Зарплата павінна быць зароблена за кошт росту вытворчасці, экспарту, росту прадукцыйнасці працы».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

**Пасля ўдару расійскіх ПКС загінулі тры турэцкія вайскоўцы**

Паветрана-касмічныя сілы Расіі пры нанясенні ўдару ў Сірыі кіраваліся каардынатамі, якія былі перададзены Турцыяй. Згодна з гэтымі данымі, там не павінна было быць турэцкіх вайскоўцаў, паведаміў прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў. Ён растлумачыў, што сітуацыя зразумелая абодвум бакам, ніякіх спрэчных момантаў не ўзнікла, а таксама падкрэсліў, што неабходна ўдасканальваць механізм абмену інфармацыяй пры выкананні сумесных аперацый. Раней Дзмітрый Пяскоў паведаміў, што Уладзімір Пуцін выказаў спачуванні турэцкаму прэзідэнту Рэджэпу Тайпу Эрдагану ў сувязі з гібеллю трох вайскоўцаў ад ненаўмыснага ўдару ПКС Расіі каля сірыйскага горада Эль-Баб.

**Кошт сцяны на мяжы з Мексікай перавышае $20 млрд**

Рэальны кошт сцяны на мяжы Мексікі і ЗША, якую абяцаў пабудаваць прэзідэнт Дональд Трамп, можа аказацца ўдвая вышэйшым, чым вызначаны паводле папярэдняй ацэнкі, зробленай у ходзе перадвыбарнай кампаніі. Як вынікае з даклада Міністэрства ўнутранай бяспекі, узвядзенне загарод абыдзецца ў 21,6 млрд долараў. Пры гэтым незалежныя кампаніі называюць кошт аж да $25 млрд. Падчас перадвыбарнай кампаніі будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай стала адным з самых рэзанансных абяцанняў будучага прэзідэнта. Тады ён ацэньваў праект у суму да 12 млрд долараў.

**Жыхары Манголіі прымаюць удзел у выплаце дзярждоўгу**

Мангольскія ўлады павінны выплаціць 580 млн долараў трымальнікам дзяржаблігацый, але грошай у казне няма. На дапамогу ўладам прыйшлі простыя манголы, якія арганізавалі збор сродкаў на выплату даўгоў урада. У ход ідуць грошы, каштоўнасці, каштоўныя рэчы, у тым ліку і пародзістыя коні. Прэм'ер-міністр МНР Жаргалтулгын Эрдэнэбат сцвярджае, што не звяртаўся да грамадзян з просьбай аб дапамозе, але дадае: урад не адмаўляецца ні ад якой дапамогі.

**У Новай Зеландыі на бераг выкінуліся сотні кітоў**

Гэта адзін з самых масавых выпадкаў самагубства такіх млекакормячых, калі-небудзь зарэгістраваных у краіне. Мясцовыя жыхары і валанцёры, каб не даць кітам зноў выкінуцца, утварылі каля берага жывы ланцуг.



Адназначнага адказу на пытанне, што прымушае жывёл здзяйсняць самагубства, у навукоўцаў няма. Самай папулярнай застаецца тэорыя, згодна з якой нешта здараецца з адным ці некалькімі кітамі, пасля чаго тыя выдаюць сігнал бедства, і астатнія прыходзяць на дапамогу.

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

Фондом «Гронооблимущество» проводится аукцион по продаже здания яслей-сада с пристройкой и принадлежностями, расположенного по адресу: Волковысский район, Росский сельсовет, агрогородок Эндриховцы, улица Молодежная, 2. Начальная цена продажи 55 092 руб. 16 коп. Размер задатка – 5 510 руб. 00 коп.

АУКЦИОН СОСТОИТСЯ 20 февраля 2017 года в 11.30.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 14 февраля 2017 года до 13.00.

Подробная информация по телефонам: в г. Волковыске – (801512) 4-50-25; в г. Гродно – (80152) 772915, 722518.

УНП 500580576

# ВЫСОКАЯ МОДА ЁСЦЬ І Ў КНІЗЕ

**Гран-пры 56-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» атрымала факсімільнае выданне «Кніжная спадчына Францыска Скарыны»**

**У кнізе важны не толькі змест, але і ілюстрацыі, дызайн, паліграфічнае выкананне, арыгінальнае (ці наадварот, традыцыйнае) мастацкае рашэнне. Тое, як выглядае выданне, у многім вызначае, ці будзе яно прывабліваць увагу чытача, ці знойдзе сваё месца на паліцы любімых кніг.**


Фота Надзеі БУЖАН.

Айчынная выдавецкая галіна і ў краіне, і ў міжнароднай супольнасці традыцыйна адзначаецца за захаванне высокай культуры кнігі. Таму і Нацыянальны конкурс «Мастацтва кнігі», што ў нашай краіне прайшоў вось ужо 56-ы раз, засведчыў: беларусы шануюць кнігу, чытанне, нашы нацыянальныя каштоўнасці, якія знайшлі ўвасабленне ў літаратуры. Так, учора на цэнтральнай пляцоўцы Нацыянальнага стэнда Рэспублікі Беларусь былі ўганараваныя 38 самых адметных кніг, а таксама мастакі і дызайнеры, якія прадставілі самыя прыгожыя выданні. Урачыстая цырымонія прайшла падчас XXIV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.

Сімвалічна, што конкурс «Мастацтва кнігі» сёлета быў асветлены зоркай Францыска Скарыны. Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання тут прадстаўленая намінацыя «Першадрук». Яе пераможцам стала кніга Анатоля Цітова **«Шляхамі Францыска Скарыны»**, што пабачыла свет у выдавецтве «Народная асвета». У гэтай жа намінацыі адзначаны адразу два праекты «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі». Так, дыплом І ступені атрымала **трохтомная дзіцячая энцыклапедыя пра першадрукара**, падрыхтаваная намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, кандыдатам культуралогіі Алесем Сушам, а спецыяльны дыплом прысуджаны кнізе **«Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку»**. Не застаўся без увагі і праект выдавецтва «Мастацкая літаратура» **«Францыск Скарына. Са слаўнага горада Полацка»** — ён атрымаў дыплом ІІ ступені.

Тэма 500-годдзя беларускага кнігадрукавання прагучала і ў намінацыі «Садружнасць», дзе адзначаюцца найлепшыя сумесныя выдавецкія праекты ў межах СНД. Тут пераможцам стала кніга Алеся Сушы **«Францыск Скарына — чалавек свету»**.

Заўважыла кампетэнтнае журы і кнігі, што пабачылі свет у Выдавецкім доме «Звязда». Дыплом І ступені ў намінацыі «Літ-фармат», дзе адзначаюцца найпрыгажэйшыя літаратурна-мастацкія выданні, атрымала кніга Міколы Мятліцкага **«Скарб бяздонны»**, а ў намінацыі «Арт-кніга» — за найлепшы выдавецкі праект па мастацтве — дыплом ІІ ступені прысуджаны альбому **«Рукою майстра. Творчасць мастакоў Міншчыны»**.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Не абмініце

# ЛЕГЕНДЫ, ВЫШЫЎКА І ЭЛА З ФІНЛЯНДЫІ

## Топ-5 кніжных навінак ад беларускіх выдаўцоў

**Новенькія, яскравыя, яны яшчэ пахнуць друкарскай фарбай, але ўжо гатовыя заняць свае месцы на паліцах хатніх бібліятэк, быць падоранымі сябрам, родным, у цэлым аматарам кнігі. Ужо стала добрай традыцыяй для беларускіх выдаўцоў менавіта падчас Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу прадстаўляць самыя новыя і актуальныя праекты. Карэспандэнт «Звязды» ў ліку іншых навінак прыкмеціла залатую пяцёрку кніг, з якімі, на яе думку, абавязкова павінен пазнаёміцца і беларускі чытач.**

**Янка Купала. Для тых, якіх люблю. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2017.**




Сёлета, у год 135-га юбілею песняра, упэўнена, нас чакае яшчэ мноства кніжных прэм'ер — выданняў, так ці інакш звязаных з жыццём і творчасцю аднаго з пачынальнікаў беларускай літаратуры. Але думаецца, менавіта гэтая кніга, з'яўляючыся першай свяочнай ластаўкай, так і застанецца адным з найярчэйшых праектаў. Пад вокладкай выдання ўкладальнік Віктар Шніп сабраў успаміны пра Янку Купалу, напісаныя сястрой, пляменніцай класіка, яго паплечнікамі, сябрамі і вучнямі. Паэтычную частку кнігі складаюць выбраныя праграмныя творы Купалы, паэмы «Бандароўна», «Курган», «Магіла льва», «Яна і я». Таксама тут можна знайсці п'есу «Паўлінка». Варта падкрэсліць, што выданне багата аздобленае архіўнымі і сучаснымі фотаздымкамі.




**Настасся Глушко, Настасся Ярмалінская. Традыцыйная беларуская вышыўка. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017.**

Гэта не проста кніга. Ды і, па вялікім рахунку, — зусім не кніга. Альбом, складзены з асобных паштовак незвычайнага фармату, прадстаўляе традыцыйныя беларускія ўзоры для вышыўкі, падае схемы для вышывання, дае парады майстрыхам. Тут сабраны выявы аўтэнтычных тэкстыльных вырабаў з калекцыі Студэнцкага этнаграфічнага таварыства. Гэтая маладзёжная грамадская арганізацыя (дарэчы, акрэдытаваная пры ЮНЕСКА) ужо больш як 20 гадоў ладзіць экспедыцыі ў розныя рэгіёны Беларусі, акрамя фальклору збіраючы прадметы побыту, тэкстыльныя рэчы, рамесніцкія прылады. Аўтары выдання — вопытныя майстрыхі і даследчыцы, гатовыя падзяліцца сваім досведам з усімі аматарамі традыцыйнай беларускай культуры.

**Мікола Мятліцкі. Скарб бяздонны. — Мінск: Звязда, 2016.**




Беларускія легенды і паданні пра паходжанне гарадоў, вёсак, рэк і азёр — сапраўды бяздонная крыніца натхнення для творчага чалавека. Вось і вядомы паэт, перакладчык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Мікола Мятліцкі настолькі захапіўся вандроўкамі ў далёкую мінуўшчыну беларускай зямлі, што напісаў цэлую кнігу. Героямі яго паэтычных легендаў і паданняў становяцца і сапраўдныя гістарычныя асобы, і персанажы, якія маглі жыць тут шмат стагоддзяў таму. Мы даведаемся пра паходжанне Крэва, легенду загадкавага Лоскага замка, прачытаем пра красуню Віліяну і яшчэ раз прыгадаем паданне пра Нёман і Лошу. Яшчэ больш казачным і чароўным выданне робяць ілюстрацыі Ігара Гардзіёнка.




**Людміла Рублеўская. Дагератып. — Мінск: Янушкевіч, 2017.**

Сцвярджэнню, што нашы сучаснікі не чытаюць папяровых кніг, можна супрацьпаставіць адразу некалькі яскравых навінак апошняга часу, якія здолелі пабачыць свет менавіта дзякуючы фінансавай падтрымцы публікі. Напрыклад, нашумелы дзённік Андруся Горвата «Радзіва «Прудок», выдадзены з дапамогай краўдфандынгавай кампаніі, стаўся сапраўднай сенсацыяй. Выданне беларускамоўнага перакладу «Караліны» Ніла Геймана таксама падтрымалі чытачы. І вось — новы кніжны праект, якому беларусы адпачатку паставілі моцную «10». У рамане «Дагератып» Людміла Рублеўская абяцае шмат загадак і таямніц. Нас чакае вандроўка ў мінуўшчыну і знаёмства з «праклятай» фотакалекцыяй.

**Ціма Парвела. Эла і сябры. Пераклад з фінскай Алены Казловай. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2017.**




Часам самыя звычайныя рэчы дапытлівым школьнікам (асабліва першакласнікам) падаюцца загадкавымі, нават падазронымі. Вось і ліст, які атрымлівае іх настаўнік і пасля якога становіцца няўважлівым, непатрабавальным і нават абыякавым да сваіх вучняў, Эла і сябры лічаць пасланнем ад шантажыста. Далей — болей. Шпіёнскія гульні, тэлефонныя званкі і нават падмена чамаданаў: сябры мяркуюць, што ў ім настаўнік нясе шантажысту грошы... Гэтая кніга палюбілася ўжо многім чытачам у розных краінах свету. Дарэчы, для кожнага з перакладных выданняў мастакі рыхтуюць новыя ілюстрацыі, якія лепш адпавядаюць культуры краіны. І, як прызнаўся сам аўтар (дарэчы, ён стаў госцем Мінскай кніжнай выстаўкі-кірмашу), малюнкі для беларускай кнігі — а яны пазычаны з літоўскай — яму самому падабаюцца найбольш.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Запрашальнік

# ПАЗМАГАЦЦА ЗА МАРУ

## Беларускія тэнісісткі дэбютуюць у Сусветнай групе Кубка Федэрацыі

**Матч самага прэстыжнага каманднага турніру Беларусь — Нідэрланды прымае Мінск. Для гэтага «Чыжоўка-Арэна» ўжо тыдзень як пераўвасобілася з лядовай пляцоўкі ў тэнісны корт. У якасці пакрыцця беларуская каманда выбрала хард, таму матчы чакаюцца хуткімі і, спадзяёмся, стануць пераможнымі для нашай каманды.**

Тэнісісткі Беларусі і Галандыі ў рамках Кубка Федэрацыі сустракаліся тройчы, але не ў Сусветнай групе, а рангам ніжэй. Усе гэтыя сустрэчы скончыліся паражэннем нашых дзяўчат. Апошняе рандэву адбылося не так даўно — у 2014 годзе. Пасля гэтага нашы саперніцы пачалі паступальны рух уверх і ўжо ў мінулым сезоне галандкі зрабілі сапраўдны сюрпрыз, абыграўшы зборную Расіі ў першым крузе. У 2016 годзе ў іх наогул атрымалася дабрацца да паўфіналу Сусветнай групы, але там тэнісісткі з Нідэрландаў саступілі француженкам.

*— За час, які прайшоў пасля нашай апошняй сустрэчы, шмат чаго магло змяніцца — можна было ўвайсці ў топ-50 або нават выпасці за межы топ-200. Да кожнага матча трэба падыходзіць асобна. Тут ужо іншая атмасфера, тут мы гуляем за выхад у топ-4. Гэта будзе супрацьстаянне толькі дзвюх камандаў, а тады матч праходзіў у больш нізкай зоне і Галандыя была ўжо чацвёртай зборнай, супраць якой мы гулялі,* — расказвае **Вольга ГАВАРЦОВА.**

Перад дамашнім матчам зборная Беларусі знаходзіцца на 8-м месцы ў камандным рэйтынгу, Нідэрланды — на 5-й пазіцыі. У складзе гасцей няма зорак, але ўсе тэнісісткі добрага ўзроўню, у Мінск прыехалі — Кікі Бертэнс, Сіндзі Бёрхер, Аранча Рас і Міхаэла Крайчык. Капітан каманды — славуты тэнісіст Паўль Хархёйс (былая першая ракетка свету ў парным разрадзе).

Наш квартэт выглядае так: Аляксандра Сасновіч, Вольга Гаварцова, Арына Сабаленка і Вера Лапко. Не хапае «козыра», які дапамог бы вывесці каманду ў эліту. Маладая мама Вікторыя Азаранка будзе хварэць за беларускіх дзяўчат на адлегласці.

Адзначым, што нашы спартсменкі ўпершыню гуляюць на такім высокім узроўні — у Сусветнай групе Кубка Федэрацыі. Нагадаем, туды яны трапілі, абыграўшы не каго-небудзь, а самых расіянак. І, вядома, цяпер каманда Эдуарда Дуброва зробіць усё, каб пазмагацца за сваю мару і працягнуць удзел у турніры.

*— Падрыхтоўка да гэтай сустрэчы пачалася на наступны ж дзень пасля таго, як мы перамаглі каманду Расіі. Бо тады ўжо ведалі, хто наш будучы сапернік. Гульцы індывідуальна ездзілі на свае турніры, мая ж задача заключалася ў тым, каб адсочваць іх вынікі. І ўсё было паспяхова — у рэйтынгу ўсе паволі падымаліся. Пасля Australian Open мы пачалі рыхтавацца ў Мінску. Дзейнічалі па плане, аб'ём работы быў вельмі вялікі. Усе трэніраваліся з поўнай аддачай, але не забывалі і адпачываць. Лічу, што мы можам выступіць вельмі годна на гэтым турніры. Усе гарацць жаданнем зрабіць падарунак сабе і ў першую чаргу народу,* — адзначыў **капітан нашай зборнай Эдуард ДУБРОЎ.**

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

**Расклад турніру:**
**11 лютага (субота), 11.40 — цырымонія адкрыцця матча, пасля якой адбудуцца дзве адзіночныя сустрэчы;**
**12 лютага (нядзеля), 10.45 — дзве адзіночныя сустрэчы і парны матч.**

■ Здарэнне

# Небяспечныя жарты ў метро

## Затрыманы чарговы «тэрарыст»

**На сталічнай станцыі метро «Пятроўшчына» зноў пажартавалі пра бомбу. Вырашаецца пытанне аб завядзенні крымінальнай справы.**

Па інфармацыі УУС па ахове Мінскага метрапалітэна, мужчына, праходзячы працэдуру дагляду, паведаміў, што ў яго ў сумцы бомба. Выбухоўка прыстасавання не аказалася, а мужчына, як высветлілася, «проста пажартаваў». «Кожны раз, расказваючы пра такія факты, мы заклікаем грамадзян ставіцца сур'ёзна да падобных заяў і думаць пра наступствы», звярнуліся праваахоўнікі да жыхароў і гасцей горада. За 2016 год зарэгістравана 11 злачынстваў — заведама ілжывых паведамленняў аб небяспецы. «Мы чарговы раз нагадваем, што кожнае такое паведамленне, якое праяўляецца ў дзеяннях, што ствараюць небяспеку для жыцця і здароўя грамадзян, альбо прычыненні шкоды ў буйным памеры альбо іншых цяжкіх наступствах кваліфікуюцца як злачынства, прадугледжанае артыкулам 340 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ПАСПЕЦЬ ЗА ПЯЦЬ ДЗЁН

## Што паглядзець замежніку ў нашай краіне

**Заўтра ўступае ў сілу Указ Прэзідэнта №8 «Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян». «Звязда» апытала замежных дыпламатаў, якія працуюць у нашай краіне або неаднойчы тут бывалі, што б яны парэкамендавалі паглядзець сваім суайчыннікам у Беларусі. З такім жа пытаннем мы звярнуліся і да беларускіх знаўцаў свайго краю.**

## ПОГЛЯД ЗВОНКУ

**Пасол Швецыі ў Беларусі Марцін ОБЕРГ** параіў сваім суайчыннікам наведаць Белавежскую пушчу. «Па-першае, шведы любяць прыроду, а па-другое, у Швецыі няма зуброў», — адзначыў пасол. Акрамя таго, варта адправіцца ў Мірскі замак. «Чаму? Гэта адзін з самых важных архітэктурна-гістарычных беларускіх аб'ектаў. Таксама з пачатку лета і да канца турыстычнага сезону ў гэтым замку будзе праводзіцца сумесная беларуска-шведская выстава. На ёй можна ўбачыць трафеі шведаў, вывезеныя з тэрыторыі Беларусі падчас Паўночных войнаў. І вось упершыню яны вернуцца ў вашу краіну». Па словах пасла, гэтыя экспанаты выстаўляюцца ў Музеі арміі ў Стакгольме, а зусім хутка іх змогуць убачыць і беларусы.

**Майкл МАРГУЛІС, ганаровы консул Рэспублікі Беларусь у штаце Фларыда (ЗША), выдавец часопіса «US-Belarus Observer»:**

— Амерыканцу ў гэтым плане цікава тое, пра што мы пішам у нашым часопісе пастаянна. Гэта і беларускія лясы, і паляўнічы турызм, агратурызм, медыцынскі турызм... Нераўнадушныя яны і да гісторыка-культурнай спадчыны, але трэба разумець, што амерыканцу, як, відаць, і іншаму турысту, цікава ў першую чаргу тое, чаго ён не зможа ўбачыць, паспрабаваць у сваёй краіне — у нашым выпадку Злучаных Штатах.

**Аляксандр ПЯТРОЎСКІ, афіцэр па міграцыйных пытаннях, прадстаўнік Міністэрства ўнутраных спраў Латвіі ў Пасольстве Латвійскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь**, адзначыў, што яму асабіста вельмі падабаецца Мінск.

— На што раю звярнуць увагу калегам, латышскім турыстам у Мінску? Па-першае, на архітэктуру. Такі адмысловы савецкі мадэрнізм, адрозны ад той жа Масквы, захавалася савецкая атрыбутыка. Па-другое, цікавасць уяўляе і сучасная архітэктура беларускай сталіцы. Яна высокага ўзроўню ў параўнанні нават з еўрапейскімі краінамі.

Я таксама сказаў бы, што падарожжа ў Беларусь будзе цікавым у першую чаргу для маіх суайчыннікаў сталага ўзросту, тых, хто памятае Савецкі Саюз. Ім прыйдзецца даспадобы і музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, і Лінія Сталіна.

Добра будзе пазнаёміцца і з аб'ектамі, што звязаны з захаваннем нацыянальнай культуры, яе здабыткаў. Гэта і музей у Азярцы, і Дудуткі. Калі будзе больш часу, то трэба наведаць Белавежскую пушчу, Аўгустоўскі канал, Браслаўскія азёры... Апошнія, дарэчы, выдатны варыянт адпачынку на прыродзе па добрай цане.

Нельга забывацца і пра нацыянальную кухню — ёй можна прысвяціць некалькі дзён! Добрыя ў Беларусі спартыўныя аб'екты...

Асобна скажу пра выдатна развітую дарожную інфраструктуру. Усю Беларусь пры жаданні можна аб'ехаць за тыя пяць дзён! Людзі тут добра ставяцца да замежнікаў, ды і руская мова зразумелая нашым старэйшым суайчыннікам, якія родам з СССР.

А вось **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Румыніі ў Беларусі Віарэл МАШАНУ** лічыць, што ўсе беларускія славутасці будзе складана аб'ехаць за пяць «бязвізавых» дзён.

— Славутасцяў у Беларусі нашмат больш, чым можа быць ахоплена за пяць дзён знаходжання ў краіне. Акрамя Мінска і яго ваколіц (Сула, Дудуткі, Ракаў, Смілавічы), трэба абавязкова паглядзець Мірскі і Нясвіжскі замкі. Па дарозе ў Брэст ці Гродна, трэба заехаць у Навагрудак, Ружаны і Пружаны. Полацк, Віцебск (асабліва падчас Славянскага базару), Орша, Мсціслаў могуць стаць іншай часткай паездкі. Хто любіць прыроду, павінен наведаць Нарачанскі, Налібоцкі і Бярэзінскі нацыянальныя паркі.

**Мігель Мантаньес ВІДАЛЬ, ганаровы віцэ-консул Рэспублікі Перу ў Рэспубліцы Беларусь**, у першую чаргу раіў бы сваім суайчыннікам наведаць нашы музеі: Нацыянальны мастацкі, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

— Увогуле мне вельмі падабаецца Мінск, іншыя беларускія гарады, такія як Гродна, Брэст. Тут шмат што можна паказаць суайчыннікам.

Цікава перуанцам будзе паглядзець на Нацыянальную бібліятэку, пабываць у ёй унутры. У нас у Перу няма зуброў, таму маім суайчыннікам было б цікава паглядзець на гэтых магутных звяроў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Браслаўскія азёры.

## ПОГЛЯД ЗНУТРЫ

**Рыгор БЫСЮК, дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»:**

— На Брэстчыне шмат мясцін, з якімі цікава будзе пазнаёміцца замежнаму турысту. Гэта, вядома, Белавежская пушча з яе ўнікальнай прыродай, таксама палац Сапегаў у Ружанах, непаўторны Пружанскі палацык. Музей-сядзіба Тадэвуша Касцюшкі ў Івацэвіцкім раёне і музейны комплекс Напалеона Орды на Іванаўшчыне стануць прыцягальнымі для таго, хто цікавіца асобамі, знакамітымі ў многіх краінах свету. Можна, несумненна, паехаць у Пінск, сталіцу Палесся, наведаць яго музеі, касцёлы, знакаміты кляштар францысканцаў.

А ў Брэсце надвячоркам абавязкова трэба зайсці на пешаходную вуліцу Савецкую, дачакацца, пакуль ліхтаршчык запаліць святло. Кажуць, пры гэтым можна загадаць жаданне. Ну і ніводзін турыст не мінае наш знакавы аб'ект — Брэсцкую крэпасць. Музей абароны, экспазіцыю «Музей вайны — тэрыторыя міру», музей фартыфікацыйных пабудоў старой крэпасці «5-ы форт» наведалі летась прыкладна 400 тысяч турыстаў. Мы гатовы прыняць і мільён гасцей.

**Георгій МАЛІНОЎСКІ, дырэктар Магілёўскага дзяржаўнага прафесійнага агралесатэхнічнага каледжа імя К. Арлоўскага:**

— Тыя, хто наведаюць Магілёў, і, у прыватнасці, наш заасад, не пашкадуюць. Ад стасункаў са светам жывёл яны атрымаюць шмат прыемных эмоцый. Статак плямістых аленяў, ланяў, зуброў, асобныя вальеры для драпежнікаў, капытных — тут створаны ўсе ўмовы, каб звяры адчувалі сябе, як на прыродзе. Каб было цікавей за імі назіраць, мы стварылі сваё сафары. У глыб лесу пракладзена невялікая чыгуначная дарога, па якой можна падарожнічаць у спецыяльна зробленым міні-цягніку. З вокнаў адкрываецца маляўнічы від на прыгожыя лясныя пейзажы з тутэйшымі насельнікамі. Спатрэбіцца як мінімум паўдня, каб азнаёміцца з усімі куточкамі заасада.

На тэрыторыі каледжа ёсць таксама ўнікальная ваенная экспазіцыя.

Нашым гасцям не трэба будзе думаць і пра тое, дзе спыніцца, каб пераначаваць. На тэрыторыі каледжа знаходзіцца вельмі камфартабельная гасцініца з двухмеснымі нумарамі з усімі выгодамі. Да паслуг турыстаў — атлетычная зала, інтэрнэт-клуб. Так што расчараваныя яны не будуць.

**Тацццяна ШОДА, галоўны захавальнік фондаў музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля:**

— Абавязкова трэба пабачыць наш палацава-паркавы ансамбль — візітоўку абласнога цэнтра. У любую пару года наш парк прыцягальны, нашы вавёркі будуць карміцца ў вас з рук, а з вясны лебедзі ў сажалцы парадуюць сваёй вытанчанасцю. У музеі, які на тэрыторыі ансамбля, ёсць ікона Маці Божай Смаленскай. Такі іканаграфічны сюжэт вельмі рэдкі на постсавецкай прасторы. Аналагічных толькі тры, у тым ліку ў Эрмітажы. У нас знаходзяцца ўнікальныя дакументы і рэчы са збору ўладальнікаў гомельскага маёнтка і вельмі вядомы Чонкаўскі скарб.

Гомельскі музей ваеннай славы таксама трэба наведаць абавязкова. Турысты, якія прыязджаюць з-за мяжы, заўсёды кажуць, што такія экспазіцыі вельмі патрэбны, бо яны расказваюць гісторыю адной з найбуйнейшых трагедый ХХ стагоддзя. Заўсёды ўражваюць сапраўдныя ўзоры ваеннай тэхнікі на пляцоўцы пад адкрытым небам. У музеі крыміналістыкі вам раскажуць пра тое, што пісьменнікі Ільф і Пятроў знайшлі правобраз Астапа Бэндэра на прыкладзе адной з гісторый, якая адбылася ў Гомелі ў 1920-я гады.

Музей фарсіравання Дняпра ў Лоеве сведчыць аб адной з самых жорсткіх старонак Вялікай Айчыннай. Гітлер казаў, што хутчэй Днепр пацячэ назад, чым рускія яго возьмуць. А яны яго ўзялі цаной найвялікіх чалавечых страт. Напэўна, многія турысты, якія прыязджаюць на Гомельшчыну, зробяць адкрыццё, што план «Барбароса» быў пахаваны на нашай беларускай зямлі, тут адбывалася асноўныя бітвы Вялікай Айчыннай.

**Архімандрыт АМВРОСІЙ (Шаўцоў) — намеснік Гомельскага Свята-Мікольскага мужчынскага манастыра.**

— Мне здаецца, замежнікам абавязкова трэба наведаць наш знакаміты Веткаўскі музей стараабраднііцтва і беларускіх традыцый, дзе знаходзіцца ўнікальная калекцыя старажытных ікон.

Цікава будзе пабываць у старажытным Тураве і пакланіцца яго знакамітым крыжам. Кажуць, што дзясяткі каменных крыжоў у Тураў прыплылі з Кіева па Дняпры і Прыпяці — супраць цячэння. А два растуць з-пад зямлі на Барысаглебскіх могілках. Там жа застаўся падмурак найбуйнейшай царквы, пабудаванай у XII стагоддзі і разбуранай землятрусам.

У Карму Добрушскага раёна паломнікам абавязкова трэба з'ездзіць, каб пакланіцца мошчам святога Іаана Кармянскага. Я параіў бы наведаць вёску Юравічы ў Калінкавіцкім раёне, заснаваную ў Х стагоддзі. Там знаходзяцца стаянка першабытнага чалавека і Свята-Раство-Багародзічны мужчынскі манастыр. Цудатворны абраз Юравіцкай іконы Божай Маці (Літасцівай), які там захоўваецца з 1630 года, ушаноўваецца праваслаўнымі і католікамі. У нас на Гомельшчыне ёсць некалькі прыгожых крыніц, дзе вернікі атрымліваюць вылячэнне: Казанскай іконы Божай Маці ў Гомелі, у вёсцы Чорнае Рагачоўскага раёна, у Новай Гуце, у Пакалюбічах, у Свержыне...

І безумоўна, усіх прываблівае непаўторная прырода Беларусі, яе азёры, рэкі і балоты. Тут жа на Палессі шмат грыбоў і ягад. Мне вельмі падабаецца места на Лоеўшчыне, дзе воды Сожа ўліваюцца ў магутны Днепр.

**Вітольд ІВАНОЎСКІ, гродзенскі краязнаўца:**

— Аматары рэлігійнага турызму могуць убачыць у Гродне храмы многіх канфесій. Усе яны дзейнічаюць. Гэта вельмі талерантны горад.

Па-першае, самая старажытная ў Беларусі і Усходняй Еўропе праваслаўная царква Барыса і Глеба, ці Каложская, якая дайшла з XII стагоддзя. Адзінае, што пашкодзіла яе, — гэта паводка на Нёмане ў 1863 годзе. Але царква дзейнічае і даступная для турыстаў.

Па-другое, каталіцкі Фарны касцёл, ці сабор Святога Францыска Ксаверыя, уражвае самым вялікім у Еўропе драўляным алтаром вышынёй 22 м.

Знакамітая харальная сінагога — адзіная ў Беларусі. Хоць яе фасад дабудаваны пазней, але малельная зала захавалася з XIV стагоддзя, тут створаны музей гродзенскага яўрэйства. Таксама ў Гродне знаходзіцца адзіная ў Беларусі лютэранская кірха, дзе не толькі праходзяць службы, але і адбываюцца канцэрты арганнай музыкі. На іх выступаюць музыканты з розных краін свету.

У Гродне ёсць унікальныя аб'екты, якія захаваліся з часоў Першай сусветнай вайны. Гэта знакамітыя форты, усяго іх было 13, але ўсе яны былі зруйнаваны, за выключэннем некалькіх. Цалкам дайшоў да нас галоўны форт, які наведваў расійскі імператар Мікалай II са сваёй світай.

У турыстычны маршрут уключаны яшчэ адзін форт, які таксама захаваўся ў добрым стане. На дарозе да форта можна зрабіць прыпынак у былым маёнтку графа Тызенгаўза, які быў у Польскім каралеўстве міністрам фінансаў, а пасля гродзенскім старостам. Былы комплекс адноўлены ў адпаведнасці з яго гістарычным аблічам. Цяпер тут можна зрабіць прыпынак, адпачыць, для турыста створаны добрыя ўмовы. Дарэчы, прыклад узнаўлення старажытнага комплексу цалкам — з'ява даволі рэдкая, як у Беларусі, так і ў Еўропе.

**У ТЭМУ: З 26 кастрычніка 2016 года замежныя турысты могуць наведваць Гродна і частку раёна без візы. Гэта тэрыторыя аб'яднана агульнай назвай — парк «Аўгустоўскі канал». У бязвізавай зоне замежны турыст можа знаходзіцца да 5 сутак. За гэты час новымі ўмовамі скарысталіся 3,5 тысячы замежнікаў.**

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ,**
lukashevich@zviazda.by
**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
yackevich@zviazda.by
**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
zigulya@zviazda.by
**Ірына АСТАШКЕВІЧ,**
astashkevich@zviazda.by
**Надзея ЮШКЕВІЧ,**
yushkevich@zviazda.by
**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# КАБ НЕ КАЛОЛА ВОЧЫ

## Чым скончыцца барацьба са школьнымі паборамі?



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Бацькоўскім камітэтам ва ўстановах адукацыі афіцыйна забаранілі збіраць грошы. Міністэрства адукацыі апублікавала дзве пастановы, якія размяжоўваюць функцыі папячыцельскага савета і бацькоўскага камітэта школы. З іх вынікае, што наяўныя сродкі цяпер знаходзяцца па-за законам. Пункт, у якім пералічваюцца кампетэнцыі бацькоўскага камітэта ўстановы адукацыі, быў дапоўнены фразай «за выключэннем пытанняў, якія датычацца прыцягнення грашовых сродкаў для забеспячэння дзейнасці ўстаноў адукацыі».**

**У галоўным адукацыйным ведамстве тлумачаць: калі бацькі пажадаюць пералічыць сродкі школе, яны могуць зрабіць гэта добраахвотна і толькі праз банк. Трэба заўважыць, што гэта ўжо не першая спроба спыніць хвалю абурэння з боку бацькоў, у якіх нават згадванне пра чарговую порцыю добраахвотна-прымусовых ахвяраванняў на патрэбы класа ці школы выклікае лёгкую істэрыку. Невыпадкова па сецыве гуляе шмат анекдотаў на гэту тэму накшталт: «У дзіцяці ў школе першы бацькоўскі сход. Усіх папрасілі абавязкова ўзяць з сабой пашпарт. Напэўна, будуць адразу афармляць крэдыт на другі клас...»**

### Бацькоўская праўда

— Больш не магу пра гэта чуць, — прызнаецца мне маці шасцікласніцы, якая чатыры гады ўзначальвала бацькоўскі камітэт у класе. — Цэлы год пасля таго, як выйшла з бацькоўскага камітэта, захоўвала ўсе квітанцыі і чэкі, каб у любы момант адказаць на пытанні, якія маглі ўзнікнуць у іншых бацькоў. Сама настойвала на тым, каб усе мае фінансавыя аперацыі кантраляваліся. У пэўным сэнсе нам пашанцавала: паколькі школа — новая, грошай на сур'ёзны рамонт ці замену вокнаў збіраць не даводзілася. З апошніх агучаных патрэб, якія бацькі павінны закрыць за ўласныя сродкі, — набыццё ў кабінет тэлевізара (па 30 рублёў з вучня), замена свяцільнікаў, якія занадта хутка перагараюць, і ахоўных экранаў на батарэі — быццам бы гэта патрабаванне санстанцыі. Але калі былі ўведзены новыя санітарныя нормы, то, напэўна, іх выкананне — усё ж такі галаўны боль школы ці ўпраўлення адукацыі, а не бацькоў. Мы так настаўніцы і заявілі. Акрамя таго, з кожнага вучня ў школе збіраюць па 2 рублі на азеляненне школы. Прашу заўважыць, што збіраюць кожны год! Але батанічнага сада вакол школы мы не назіраем.

— Перад нашым бацькоўскім камітэтам паставілі задачу — адрамантаваць у канцы навучальнага года клас, — расказвае маці вучаніцы мінскай гімназіі. — Заявілі, што шпалеры — гэта ўжо ўчарашні дзень, цяпер сцены фарбуюць (зверху — адным колерам, знізу — іншым). Прычым ніжнюю частку сцяны трэба будзе пакрыць яшчэ і лакам, каб дзеці фарбу нагамі не сцiралі. Бацькі павінны паклапаціцца і пра тое, каб наняць брыгаду прафесіяналаў. Але самае дзіўнае, што ў наступным навучальным годзе нашы дзеці павінны перайсці ў іншы класны пакой. На лагічнае пытанне, а для каго ў такім разе мы будзем рабіць рамонт, пачулі ў адказ: «Не хвалюйцеся, тое памяшканне адрамантуюць іншыя бацькі...» Спадзяёмся, што пасля ўвядзення новага парадку прыцягнення сродкаў на патрэбы школы хоць бы пошукам будаўнічай брыгады нам займацца ўжо не давядзецца.

— Для мяне тэма пабораў вельмі непрыемная. Не магу пра гэта казаць спакойна, — адразу папярэджвае чарговы суразмоўнік. — Грошы я амаль ніколі не здаю. Аднак рабіў рамонт, фатаграфаваў дзяцей на карту вучня, вешаў тэлевізар, раблю выпускны альбом. Калі прапаноўвалі апошні раз здаць грошы на рамонт (матэрыялы плюс работа), прапанаваў зрабіць яго ўласнымі сіламі. І ў выніку зрабіў. Ніхто мне не дапамагаў. На тэлевізар, як вы ўжо зразумелі, грошы ў класе таксама збіралі. Відаць па ўсім, гэта абавязковы для ўсіх бацькоў і ўстаноў адукацыі «пункт праграмы»...

— Сумняваюся, што хтосьці адменіць у нашай гімназіі прымусова-добраахвотныя ахвяраванні ў памеры адной базавай чатыры разы на год, — кажа яшчэ адна прадстаўніца бацькоўскай грамадскасці. — Калі пералічэнні і насамрэч добраахвотныя, то навошта мы прадстаўляем класнаму кіраўніку квітанцыі аб пералічаных грашах? Прычым дакладна ведаю, што не ўсе бацькі пералічваюць сродкі ў папячыцельскі савет. Ці адбіваецца гэта неяк чынам на іх дзецях? Шчыра скажу, што не заўважала. А вось калі мы ў класе вырашылі сабраць грошы, каб памяняць у кабінеце вокны на шклопакеты, бо ўсе дарослыя стаміліся іх кожную восень заклейваць, то ніхто не адмовіўся, бо было зразумела, што гэта мы робім для сваіх дзяцей. А куды ідуць сродкі, пералічаныя ў папячыцельскі савет, нам не паведамляюць...

### На іншым баку барыкады

У настаўнікаў і кіраўнікоў устаноў адукацыі — свая праўда. Галоўны аргумент — мы да сабраных грошай не дакранаемся. Бацькі могуць вырашыць што пажадаюць — іх не спыніш. Падарункі дзецям, салодкія сталы, збор грошай на дарагія экскурсіі, выпускныя вечары, фотаальбомы, відэаздымкі... І заўсёды знойдзецца якая-небудзь незадаволеная маці, якая паскардзіцца ва ўпраўленне адукацыі, міністэрства (ці, яшчэ горш, — у газету) на паборы...

— Бацькоўскі камітэт павінен займацца не ўмацаваннем матэрыяльнай базы, а прафарыентацыйнай работай, дапамагаць педагогам арганізоўваць выхаваўчыя мерапрыемствы, а тое, што якая-небудзь Мар'я Пятроўна няправільна зразумела ці перавысіла свае паўнамоцтвы, гэта недапрацоўка класнага кіраўніка, — давялося пачуць ад прадстаўніка адміністрацыі школы. — Збіраць грошы ў школе? Яны ж не настаўніку іх збіраюць... Праблема ў тым, што некаторыя з бацькоў нярэдка занадта настойліва гэта робяць па прынцыпе «я здаў, і ты павінен».

А яшчэ «някемліваму журналісту» даходліва растлумачылі, што фонд папячыцельскага савета школы фарміруецца... са спонсарскіх сродкаў. Цікаўлюся: «А хто выступае ў ролі спонсара гімназіі ці школы? Можа, нейкія прадпрыемствы ці арганізацыі?» Высвятляецца, што знайсці заможных шэфаў нават у сталіцы праблематычна, не кажучы ўжо пра рэгіёны. Таму асноўная крыніца спонсарскай дапамогі — даходы бацькоў.

Абмяркоўваць збор грошай на рамонты ў школе, набыццё жалюзі, новых дзвярэй, сантэхнікі, штогадовае абнаўленне навагодняга інтэр'ера (штучныя ёлкі, гірлянды, ёлачныя упрыгажэнні), азеляненне тэрыторыі, усталяванне электронных прапускных сістэм і г. д., і да т. п. педагогі і кіраўнікі не настроены. Ніхто не хоча прызнаваць і той факт, што перад бацькамі навапечаных пяцікласнікаў-гімназістаў адразу ставяць (будзем спадзявацца, што гэта ўжо ў мінулым часе) шэраг задач па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай і вучэбнай базы, быццам бы падкрэсліваючы такім чынам сваю «элітарнасць». «Калі ў гімназіі ствараюцца ўсе ўмовы для навучання, то нам гэтых грошай не шкада, — канстатавала адна сям'я. — Калі ж фінансы не дазваляюць, то бацькі шукаюць гімназію з меншым «прэйскурантам» або аддаюць дзіця ў звычайную школу. Мы цудоўна разумелі, калі рабілі выбар на карысць гімназіі, чаго ад нас чакае кіраўніцтва. Педагогі — толькі іх рупар...»

### Ніякага прымусу?

А вось тут вельмі хочацца паспрачацца. Як здарылася, што адным з крытэрыяў адбору ў гімназіі стала заможнасць бацькоў, а дакладней іх гатоўнасць аказваць спонсарскую дапамогу? Пра якую ўсеагульную даступнасць адукацыі і справядлівасць конкурснага адбору можа ісці ў такім выпадку размова? Прычым усе добра ведаюць: праблема школьных пабораў у найбольшай ступені актуальная для сем'яў мінскіх школьнікаў. Можа, таму што і гімназіі ў сталіцы апошнімі гадамі раслі як грыбы пасля дажджу, а вось звычайную школу побач з домам яшчэ трэба пашукаць? Дарэчы, з рэгіёнаў скаргі даносяцца значна радзей.

**І заўсёды знойдзецца якая-небудзь незадаволеная маці, якая паскардзіцца ва ўпраўленне адукацыі, міністэрства (ці, яшчэ горш, — у газету) на паборы...**

—У нас заўсёды грошы збіраў бацькоўскі камітэт школы, у які ўваходзілі каля 40 чалавек — па прадстаўніку ад кожнага класа, — канстатуе дырэктар адной са школ у раённым цэнтры. — Разам з адміністрацыяй мы штогод складалі план падрыхтоўкі да наступнага навучальнага года і падлічвалі, якія будаўнічыя матэрыялы могуць спатрэбіцца. Выносілі прапановы на абмеркаванне бацькоўскага камітэта школы. Усё зноў падлічвалася плюс закладвалася пэўная сума на паперу, пітную ваду, вадкае мыла на ўсіх. Потым сума дзялілася з разліку на аднаго вучня. Адразу скажу, што палку мы не перагіналі. Вокны за бацькоўскія грошы не мянялі, камп'ютары не набывалі — толькі тое-сёе падфарбаваць, паклеіць, адрамантаваць. Далей бацькоўскі камітэт збіраў грошы і пералічваў іх на дабрачынны рахунак з пазнакай «на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння школы». Летась гэта сума склала 80 тысяч рублёў (старымі грашыма) на чалавека на год. І нам хапала! Мне прыносілі толькі квітанцыі з банка, каб працаўнікам было арыентавацца, колькі ўжо ёсць сродкаў і што можна на іх закупіць. Як правіла, мы заказваем усё оптам у аднаго пастаўшчыка, каб было больш танна. Потым усё набытае ставіцца на ўлік, а пасля спісваецца па меры выкарыстання з афармленнем адпаведных актаў. «Жывых» грошай у абароце няма — толькі безнаяўныя. Цяпер нам кажуць, што ўсе функцыі трэба перадаваць папячыцельскім саветам. Добра, калі дзе-небудзь у іх увойдуць насамрэч заможныя людзі, тады і ў бацькоў не давядзецца грошы прасіць. Але гэта наўрад...

***

І ўсё ж такі што зменіцца і ці зменіцца ўвогуле для бацькоў школьнікаў у святле апошніх падзей? Міністэрства адукацыі і мясцовыя органы кіравання адукацыяй і раней неаднойчы публічна выступалі супраць таго, каб у школах і садках бацькі збіралі грошы. Згадванне «пабораў» усіх раздражняла і калола вочы. Цяпер да пабораў афіцыйна аднеслі наяўныя грошы. Атрымліваецца, што пералічэнні на рахунак папячыцельскага савета — гэта ўжо не паборы, а выключна добраахвотныя ахвяраванні? Да таго ж бацькі цалкам справядліва хвалююцца: няўжо на кожную дробязь у класе давядзецца прасіць грошы ў папячыцельскага савета? Ці ўсё ж такі будзем, як і раней, набываць усе расходныя матэрыялы (паперу для прынтара і ксеракса, мыючыя і гігіенічныя сродкі, картрыджы) за ўласныя сродкі, але пад страхам, што цябе схопяць за руку і абвінавацяць... Вось толькі ў чым?

— Бацькі могуць пайсці ў банк і пералічыць пэўную суму на рахунак самой установы, — тлумачыць **прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Юлія БАРАДУН.** — У школе не маюць права патрабаваць унесці сродкі ў фонд папячыцельскага савета, як не маюць права патрабаваць ад бацькоў прадставіць фінансавы дакумент аб пералічэнні грошай. Усе акумуляваныя сродкі будуць выкарыстоўвацца па мэтавым прызначэнні ў адпаведнасці з рашэннем папячыцельскага савета, якое ўзгадняецца з кіраўніком і бацькоўскім камітэтам установы адукацыі (пры яго наяўнасці).

А мне чамусьці прыгадалася грамадская дыскусія ў 2014 годзе, калі сістэма адукацыі была комплексна прааналізавана адразу некалькімі камісіямі. Праблема бацькоўскіх капіталаўкладанняў у сістэму адукацыі абмяркоўвалася і тады, і, каб не дапускаць непрыгожых сітуацый у будучыні, прагучала прапанова пераняць досвед краін, дзе практыкуюцца першапачатковыя ўзносы пры паступленні дзіцяці ў садок. Прапаноўвалася таксама ўвесці фіксаваную суму штогадовага ўнёску на матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ўстановы адукацыі... Магчыма, гэта было б больш шчырым у адносінах да бацькоў? Ва ўсякім выпадку, чуткі пра тое, што «ў суседнім дзіцячым садку прапанавалі аплаціць нацяжныя столі ў групах», сярод бацькоў бы ўжо не хадзілі. Між іншым, яны і самі ў гутарцы прызнавалі, што працэй было б адразу вызначыцца з сумай бацькоўскіх узносаў на патрэбы школы, а не збіраць грошы ўвесь навучальны год. Вось толькі каб «апетыты» ў кіраўнікоў установ не выходзілі за межы разумнага...

**Надзея НІКАЛАЕВА,** *nikalaeva@zviazda.by*


## ОБЪЯВЛЕНИЕ
о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | Лот № 1. Полноповоротный дизельный кран RDK-36, 2013 г.в., стоимостью 201 500 рублей 80 копеек. Лот № 2. Полноповоротный дизельный кран RDK-36, 2013 г.в., стоимостью 201 500 рублей 80 копеек |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Управление механизации №88» |
| Местонахождение (адрес) имущества | Витебская область, Полоцкий район, д. Лучно |
| Обременения | Обременений нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Полоцк, ул. Успенская, 2, каб. 18 23.02.2017 в 11.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка: 211400, г. Полоцк, ул. Успенская, 2, каб. 18 (opi_polotsk@mail.ru), тел./факс (80214) 44-28-42, зам. начальника отдела – Казакова Жанна Васильевна, тел.: (80214) 44 21 59, (8-033) 687-90-33, начальник отдела – Лисова Людмила Геннадьевна, (80214) 42 64 98 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка р/с 3642903000517, ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 216, г. Полоцк, код 648, УНП300002505 не позднее 17.00 22.02.2017. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 №232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |



## ОАО «Управление механизации №91»

**извещает своих акционеров, что очередное собрание акционеров состоится 10 марта 2017 года в 10 часов по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11.**

Регистрация участников начинается с 08 часов 45 минут по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах работы финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2016 году и основных направлениях деятельности Общества на 2016 год.
2. Утверждение годового бухгалтерского отчета, баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2016 год.
3. Утверждение дивидендов за 2016 год.
4. Утверждение порядка распределения прибыли, оставшейся в распоряжении предприятия за 2016 год. О направлениях использования чистой прибыли в Обществе в 2017 году.
5. О работе наблюдательного совета и ревизионной комиссии в 2016 году.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

**Тел. 8(017) 203-65-80**

УНП 100055130 **Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации №91».**

# ШТО БАЛІЦЬ ПАСЛЯ

**А пакуль пагаворым пра тое, як змяніліся магчымасці сучаснай медыцыны для пажылых, з загадчыкам кафедры кардыялогіі і ўнутраных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктарам медыцынскіх навук, прафесарам Наталляй МІЦЬКОЎСКАЙ, дацэнтам кафедры кардыялогіі і ўнутраных захворванняў БДМУ, кандыдатам медыцынскіх навук, галоўным пазаштатным рэўматолагам Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, старшынёй Беларускага таварыства рэўматолагаў Наталляй МАРТУСЕВІЧ, дацэнтам кафедры клінічнай фармакалогіі БДМУ, кандыдатам медыцынскіх навук, галоўным клінічным фармаколагам Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Ларысай ГАЎРЫЛЕНКА, намеснікам дырэктара па медыцынскай часці Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя, кандыдатам медыцынскіх навук Таццянай ЕМЯЛЬЯНЦАВАЙ.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ.



Наталля МАРТУСЕВІЧ.



Ларыса ГАЎРЫЛЕНКА.



Таццяна ЕМЯЛЬЯНЦАВА.

## ШТРЫХІ ДА «ПАРТРЭТА»

***— Што можна сказаць пра здароўе 60-гадовых пацыентаў, якія трапляюць у поле вашага зроку?***

**Таццяна ЕМЯЛЬЯНЦАВА:** Бліжэй да вечара ў гэтым узросце ўжо зніжаюцца працаздольнасць і настрой. Ёсць праблемы са сном — цяжка прачынацца або сон рана абрываецца. Калі такое здараецца на працягу месяца, трэба звяртацца да псіхатэрапеўта (а не да тэрапеўта), які парэкамендуе снатворны прэпарат і растлумачыць, што прымаць яго больш за месяц не рэкамендуецца — можа развіцца сіндром залежнасці. У часткі людзей у гэтым узросце будзе назірацца праяўленне хваробы Альцгеймера, што сваякі могуць ігнараваць. Ім здаецца, што важней памятаць маладосць, чым бягучыя падзеі. А між тым гэта і ёсць першыя прыкметы старэння мозга. Прыкметы дэменцыі, зніжэння інтэлекту могуць заяўляць пра сябе літаральна пасля 50—60. Чым раней такі пацыент трапіць на прыём да псіхіятра або неўролага, тым эфектыўнейшай акажацца медыкаментозная тэрапія, здольная прыпыніць развіццё паталогіі. Па статыстыцы РНПЦ псіхічнага здароўя, толькі частка дэменцый звязана з хваробай Альцгеймера, каля 50 працэнтаў выпадкаў звязаны з паталогіяй сасудаў галаўнога мозга, атэрасклерозам.

**60-гадовы пацыент можа прапусціць этап развіцця гіпертаніі, набыць ішэмію і ўжо ў першыя гады пасля гэтага юбілею атрымаць першую сасудзістую катастрофу.**

**Наталля МАРТУСЕВІЧ:** У гэтым узросце можна быць наогул здаровым па нашым профілі, калі з маладосці займацца лячэбнай фізкультурай, плаваць, весці здаровы лад жыцця, а можна мець ужо шэраг сур'ёзных праблем, звязаных з мышачна-касцявой сістэмай і злучальнай тканкай.

Сярод найбольш распаўсюджаных захворванняў у гэтым узросце варта адзначыць астэаартроз і астэапароз. Фактычна ў кожнай другой жанчыны фарміруецца артроз каленных суставаў. Не рэдкім будзе артроз тазасцегнавых суставаў і суставаў кісцяў рук з дэфармацыяй пальцаў — гэта так званыя вузельчыкі Гебердэна і Бушара.

Праблема артрозу каленных і тазасцегнавых суставаў — не толькі ў празмернай нагрузцы на іх, але і ў парушэнні гарманальнага стану, зніжэнні ўзроўню эстрагенаў, якія абараняюць храсток, а таксама ў лішку тлушчавай тканкі, які парушае працэс аднаўлення храстка. Пагаршае сітуацыю і слабасць пярэдняй мышцы бядра, чаму мы і кажам аб неабходнасці лячэбнай фізкультуры, якая будзе ўмацоўваць мышцы. Праблема астэапарозу часта сустракаецца ў жанчын у постменапаўзе. У першыя пяць гадоў пасля наступлення менапаўзы мінеральная шчыльнасць касцяной тканкі страчваецца найбольш інтэнсіўна. Боль у спіне, змяншэнне росту пры гэтым патрабуюць абследавання і прымянення тэрапіі. На ўзроставую групу 60—80 гадоў прыпадае і трэцяя частка пацыентаў, хворых на рэўматоідны артрыт — аўтаімуннае запаленчае захворванне суставаў кісцяў і ступняў.

У 80 працэнтах выпадкаў у гэтым узросце сустракаецца дэгенератыўнае пашкоджанне мышцаў — рататараў манжэты пляча — тое, што ў паліклініцы нярэдка памылкова называюць артроза-артрытам або перыартрытам плечавога сустава. Звязана гэта з парушэннем біямеханікі руху плечавога сустава, яго няправільным размяшчэннем — плечы нібы ідуць наперад. З цягам часу мы будзем скардзіцца на тое, што не можам падняць руку.

Яшчэ адна праблема можа назірацца ў 90 працэнтах выпадкаў — папярэчная плоскаступнёвасць, якая правакуе няправільнае размеркаванне нагрузкі і шкодзіць суставам ног. Гэтай праблемай займаюцца траўматолагі-артапеды, а да рэўматолагаў такія пацыенты трапляюць з болем у галёнкаступнёвым суставе, звязаным з другасным артрозам, або болем, звязаным з няправільным размеркаваннем мышачнай нагрузкі, — болем праекцыі тазасцегнавых суставаў збоку, ягадзічнай вобласці. Ва ўсіх пажылых у большай ці меншай ступені ёсць і праблемы са спінай, што часта звязана з парушэннем паставы, функцый дыхання, апусканнем дыяфрагмы, выпрамленнем паясніцы.

**Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ:** У маладосці мы мала ўвагі ўдзяляем артэрыяльнай гіпертэнзіі, парушэнню вугляводнага і тлушчавага абмену і ўменню вырашаць псіхалагічныя праблемы. 30 працэнтаў людзей на планеце пакутуюць ад артэрыяльнай гіпертэнзіі. Кантроль артэрыяльнага ціску — задача кожнага. Ціск не павінен быць вышэйшым за 140/90 мм рт. сл., і няважна, наколькі добра вы сябе адчуваеце пры больш высокіх лічбах! Назіраць трэба і за вагой. У мужчын талія не павінна быць большая за 92 см, у жанчын — за 80 см.

Артэрыяльная гіпертэнзія і ішэмічная хвароба сэрца могуць працякаць без сімптомаў, а значыць, пацыент трапляе ў поле зроку ўрача, калі ўжо развілося ўскладненне — інсульт або інфаркт. Па сусветных даных, 50 працэнтаў такіх хворых да стацыянара нават не даязджаюць. Наш 60-гадовы пацыент можа прапусціць этап развіцця гіпертаніі, набыць ішэмію і ўжо ў першыя гады пасля гэтага юбілею атрымаць першую сасудзістую катастрофу. Тэрмінова звяртацца да ўрача павінна прымусіць зніжэнне пераноснасці фізічнай нагрузкі, сэрцабіцце або задышка пры звычайнай фізічнай нагрузцы. Еўрапейскае таварыства кардыёлагаў у клінічных пратаколах хранічнай сардэчнай недастатковасці звяртае ўвагу нават на задышку, якая ўзнікае проста пры нахіленні наперад!

Артэрыяльная гіпертэнзія пашкоджвае не толькі сэрца, але і сасуды галаўнога мозга, нырак, таму ў кардыялагічнага хворага можа быць і паталогія нырак, цукровы дыябет, цэрэбраваскулярная паталогія, паталогія шчытападобнай залозы. І ўсе ўзмацняюць адно аднаго. Таму неабходна назірацца ў тэрапеўта, які правільна ацэніць увесь гэты комплекс, а далей пры неабходнасці накіруе да вузкіх спецыялістаў.

**Ларыса ГАЎРЫЛЕНКА:** Калі б на нашым круглым стале прысутнічалі, напрыклад, эндакрынолаг або гастраэнтэролаг, мы ўбачылі б яшчэ больш праблем са здароўем у пажылых. А калі паслухалі б анколага, то даведаліся б пра тое, што пералічаныя захворванні не дазваляюць чалавеку дажыць да свайго генетычнага анкалагічнага або гематалагічнага захворвання.

У сучаснага пажылога пацыента можа быць некалькі паталогій, прызначэнняў і лекаў. Мы жывём у часы поліфармакатэрапіі, калі ў стацыянары не знойдзеш пацыента, якому прызначаны адзін прэпарат, — калі толькі гэта не асоба прызыўнога ўзросту. Тое ж самае і ў амбулаторнай практыцы. У ідэале патрабуецца комплексны падыход, узаемадзеянне спецыялістаў рознага профілю. Прызначэнні кардыёлага, напрыклад, павінны ўзгадняцца з псіханеўролагам, які прадухіліць негатыўныя наступствы кардыялагічнай тэрапіі.

**Мы жывём у часы поліфармакатэрапіі, калі ў стацыянары не знойдзеш пацыента, якому прызначаны адзін прэпарат, — калі толькі гэта не асоба прызыўнога ўзросту.**

Ёсць тут адказнасць і пацыента. Заўсёды падчас дзяржаўнай рэгістрацыі лекавых прэпаратаў зацвярджаюцца дзве інструкцыі па медыцынскім прымяненні — для спецыялістаў-медыкаў і лісток-укладыш для пацыентаў. На жаль, некаторыя пацыенты знаёмяцца з гэтым дакументам не для таго, каб замацаваць сказанае ўрачом, а каб напалохацца і самастойна адмяніць/змяніць дозу. У лекаў з групы стацінаў вялікі пералік пабочных эфектаў, ведаць якія трэба, каб разумець, што рабіць, калі прапусціў прыём або развілася алергічная ці іншая рэакцыя.

## ТАМ І ТУТ

***— Ці ёсць адрозненні ў развіцці айчыннай і замежнай меддапамогі пажылым?***

**Наталля МАРТУСЕВІЧ:** У ЗША, напрыклад, даволі высокі працэнт насельніцтва з вялікай вагой, а таму і праблема артрозу больш вострая. Што да астэапарозу, то для яго прафілактыкі значная доля жанчын развітых краін прымае замяшчальную гарманальную тэрапію, праўда, пры гэтым павышаюцца іншыя рызыкі, патрабуецца рэгулярнае назіранне ў гінеколага. Пры гэтым у нас праведзена досыць вялікая работа па прафілактыцы і раннім выяўленні гэтай паталогіі, а некаторыя еўрапейскія краіны толькі пачынаюць такую работу. У Беларусі за апошнія дзесяць гадоў многае змянілася, шмат маладых людзей катаюцца на веласіпедах, займаюцца спортам або лячэбнай фізкультурай, і гэта прынясе свой плён у будучыні — нам удасца пасунуць развіццё некаторых захворванняў на больш позні ўзрост.

**Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ:** Мы ўкаранілі самыя высокія тэхналогіі аказання меддапамогі цяжкай катэгорыі кардыялагічных пацыентаў. Больш за 15 гадоў я ўжо не накіроўваю сваіх пацыентаў за мяжу — усе віды дапамогі існуюць у нас. У абласных цэнтрах і нават некаторых раённых створаны структуры, куды трапляюць пацыенты з вострым каранарным сіндромам для хірургічнага ўмяшання. Аднак перш за ўсё паўстае пытанне пашырэння ведаў аб сваім здароўі. За мяжой дзякуючы высокай інфармаванасці насельніцтва ўдалося на парадак знізіць час ад моманту развіцця вострага стану да дастаўкі ў стацыянар. У выпадку парушэння мазгавога кровазвароту размова наогул ідзе пра тры гадзіны для аказання сучаснай эфектыўнай дапамогі.

Праблема першаснай прафілактыкі ў нашай краіне застаецца вельмі вострай. Які прэпарат спяшаецца адмяніць сам сабе наш кардыялагічны пацыент? Як ні дзіўна, той, што патрэбны больш за ўсё! Пацыенту могуць прызначыць правільнае, кампетэнтнае лячэнне з шасці прэпаратаў — звычайны пералік для сярэднестатыстычнага кардыялагічнага пацыента. Абавязкова будзе там і камбінаваны прэпарат, які змяшчае ў сабе два або тры найменні, але пацыент лёгка можа адмовіцца менавіта ад яго, таго, што стабілізуе артэрыяльны ціск, прафілактуе змяненні стану міякарда і развіццё сардэчнай недастатковасці. На жаль, сам пацыент не цікавіцца, што яму прызначаюць, а ў доктара проста не хапае часу, каб растлумачыць важнасць кожнага з прапісаных кампанентаў лячэння.

**Таццяна ЕМЯЛЬЯНЦАВА:** Для службы псіхіятрыі і наркалогіі не менш важным застаецца супрацоўніцтва з сацыяльнымі службамі і СМІ, якія могуць дапамагчы змяніць стаўленне грамадства да псіхіятрычных хворых, наркалагічнай дапамогі. Па-ранейшаму большасць нашых пацыентаў упускаюць своечасовы этап атрымання псіхіятрычнай дапамогі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Праця́г. Пачатак на 1-й стар.)

# 60-ці?

**Ларыса ГАЎРЫЛЕНКА:** Імпартазамяшчэнне жыццёва важных лекаў, якія ўплываюць на якасць і працягласць жыцця, забяспечвае сёння пацыенту выбар з улікам яго плацежаздольнасці. Ідзе размова і аб тым, каб як мага больш пацыентаў са складанай і рэдкай паталогіяй атрымалі магчымасць доступу да лекаў вельмі дарагіх.

**Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ:** Калі размова ідзе аб затратах з боку самога пацыента, то ўрач павінен пацікавіцца, ці ёсць у пацыента магчымасць прымаць прызначаную тэрапію. Ёсць прэпараты вельмі дарагія, і прапанаваць ім танную замену немагчыма. Разам з тым з'яўляецца ўсё больш камбінаваных лекаў, і ўсё часцей мы можам прапанаваць пацыенту некалькі відаў лекаў па розным кошце і з аднолькавымі вартасцямі. Актуальным для нас застаецца і тое, каб сваякі хворага разумелі асаблівасці захворвання, спрыялі змяненню ладу жыцця ўсёй сям'і.

## МАГУТНЫ РЫВОК

***— Якія новыя падыходы да лячэння з'явіліся апошнім часам?***

**Ларыса ГАЎРЫЛЕНКА:** Клінічныя пратаколы дыягностыкі і лячэння розных захворванняў пераглядаюцца кожныя тры-пяць гадоў. Аднак калі з'яўляюцца нейкія новыя метады лячэння або лекі, то ў нас зацвярджаецца інструкцыя на метад. У Беларусі дзейныя пратаколы распрацаваны на падставе сусветнага вопыту і доказнай медыцыны. Вельмі актыўна ў галіне распрацоўкі новых пратаколаў працуюць кардыялагічная і рэўматалагічная службы. Летась былі зацверджаны некаторыя пратаколы па гастраэнтэралогіі, на чарзе — па інфекцыйных захворваннях і неўралогіі. Абнаўляюцца пратаколы па лячэнні атлусцення і цукровага дыябету, у галіне акушэрства і гінекалогіі.

**У канцы 1990-х гадоў у аснове была толькі медыкаментозная тэрапія, але з таго часу з'явілася сістэма інтэрвенцыйных, кардыяхірургічных і рэабілітацыйных аддзяленняў, што вырашыла праблему вялікай колькасці пацыентаў з вострай і хранічнай сардэчна-сасудзістай паталогіяй.**

**Таццяна ЕМЯЛЬЯНЦАВА:** Большая частка псіхічных захворванняў, як правіла, хранічныя (залежнасці, дэменцыі, шызафрэнія, аўтызм). Таму ў сістэме аказання медпамогі важным момантам, акрамя дыягностыкі і лячэння, будзе комплексная медыцынская рэабілітацыя з улікам рэабілітацыйнага патэнцыялу кожнага. Неабходна таксама актыўна развіваць сацыяльную, працоўную, псіхалагічную дапамогу. Псіхічна хворыя людзі таксама маюць права быць шчаслівымі, мець дастойную якасць жыцця.

**Наталля МАРТУСЕВІЧ:** Адрозненні ў пратаколах лячэння ў нас і за мяжой будуць абумоўлены тым, што існуючая там сістэма страхавання дазваляе быць больш мабільнымі пры выбары дарагіх лекаў. Напрыклад, генна-інжынерная імунабіялагічная тэрапія выкарыстоўваецца ў Еўропе больш шырока. Прэпарат такога кшталту можа каштаваць каля 25 тысяч долараў на год. Зыходзячы з фіксаванай сумы, якая выдаткоўваецца на ахову здароўя, вырашыць гэта пытанне ў шырокім аспекце складана, але ў кожным канкрэтным выпадку прэпарат прызначаецца, калі стандартная тэрапія вычарпала сябе. Цяпер мы падыходзім да стварэння спісу рэдкіх захворванняў, на лячэнне якіх будзем выдаткоўваць вялікія сумы крыху шырэй.

**Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ:** Наўрад ці знойдзецца яшчэ адна галіна ў медыцыне, якая зрабіла такі рывок, як кардыялогія. У канцы 1990 гадоў у аснове была толькі медыкаментозная тэрапія, але з таго часу з'явілася сістэма інтэрвенцыйных, кардыяхірургічных і рэабілітацыйных аддзяленняў, што вырашыла праблему вялікай колькасці пацыентаў з вострай і хранічнай сардэчна-сасудзістай паталогіяй.

Замежныя калегі называюць Юрыя Астроўскага і Алега Румо геніямі ў прафесіі — за кароткі прамежак часу ім удалося стварыць каманды спецыялістаў і вывесці на перадавыя пазіцыі медпамогу для найцяжэйшых пацыентаў, якія маюць патрэбу ў перасадках сэрца, печані. Не так даўно я паказвала ў Каралінскім універсітэце (Швецыя) графікі з лічбамі аб тым, што мы маем у сучаснай беларускай кардыятэрапіі і агрэсіўным вядзенні пацыентаў, — рэакцыя была неймавернай.

Пацыент з інфарктам сёння адразу пры выкліку хуткай медпамогі атрымлівае прэпараты, якія пазбаўляюць болю, абмяжоўваюць развіццё сардэчнай катастрофы, далей трапляе ў стацыянар, дзе хоць днём, хоць ноччу яму выканаюць каранарографію, паставяць стэнты ў зоны крытычна звужэння сасудаў атэрасклератычнымі бляшкамі. Мы цалкам здольныя мінімізаваць сасудзістую катастрофу пры паступленні пацыента ў стацыянар на працягу 90 хвілін пасля агляду спецыялістам хуткай дапамогі. У Еўропе сетка медцэнтраў дазваляе забяспечыць дастаўку пацыента на працягу 40 хвілін, але і ў нас гэта будзе. Канадскія калегі, якія наведваюць Беларусь штогод, кажуць, што нямецкаму было паверыць у дасягненне такой хуткасці, глыбіні і эфектыўнасці кардыялагічнай дапамогі на працягу літаральна дваццаці гадоў. Іншая рэч, нам трэба яшчэ ўлічваць мясцовыя асаблівасці менталітэту насельніцтва, бо дзе ні пабудуй цэнтр меддапамогі, наш чалавек можа трываць і чацвёра сутак, пакуль выкліча «хуткую». Вялікая колькасць пацыентаў у нас перанесла празскураное каранарнае ўмяшанне — планавае або экстраннае, аортакаранарнае шунціраванне, нават трансплантацыю, а для таго, каб уся гэта дапамога была эфектыўнай працяглы час, урач на месцах павінен павышаць кваліфікацыю, а сваякі — падтрымліваць пацыента.

## ПАШУКАЦЬ, ДЫК ЗНОЙДЗЕЦЦА

***— З чаго пачынаць, што мець на ўвазе, калі вырашыў абследавацца?***

**Таццяна ЕМЯЛЬЯНЦАВА:** Кансультацыі ўрачоў-спецыялістаў цалкам даступныя, але чамусьці пацыент з дэменцыяй можа трапіць у іх поле зроку пасля таго, як ужо, напрыклад, спаліны дом. Дзеці заўважаюць, што з мамай «штосьці не тое», але нікуды не звяртаюцца. Або звяртаюцца толькі да ўчастковага тэрапеўта і часам не атрымліваюць той дапамогі, на якую разлічвалі. У такім выпадку, дарэчы, ёсць магчымасць звярнуцца да адміністрацыі паліклінікі, намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай часці, і ніхто вам не адмовіць.

**Наталля МАРТУСЕВІЧ:** Задача пацыента своечасова звярнуцца да ўчастковага тэрапеўта, але пацыент мае права пайсці іншым шляхам. На базе Беларускай акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Белдзяржмедуніверсітэта працуюць кансультацыйныя цэнтры, аплата паслуг у якіх досыць умоўная, а спецыялісты — высокага ўзроўню.

**Таццяна ЕМЯЛЬЯНЦАВА:** А бясплатна можна звяртацца ў кансультацыйна-паліклінічныя аддзяленні ўсіх рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў.

**Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ:** Набліжэнне меддапамогі да пацыента найбольш яскрава дэманструе паступовае ўкараненне ўрачоў агульнай практыкі — спецыялістаў са шматпрофільнымі ведамі і добрымі практычнымі навыкамі. Я наведвала некалькі ўрачэбных лабараторый на Міншчыне і сама пераканалася, што амбулаторныя карткі кардыялагічных пацыентаў цалкам адпавядаюць пратаколам. Дзякуючы гэтаму нававядзенню мы атрымаем некалі якасна іншую медыцыну пярвічнага звяна. У БДМУ дзеля гэтага будзе створана нават кафедра па падрыхтоўцы такіх урачоў.

**Таццяна ЕМЯЛЬЯНЦАВА:** Кардыялагічныя хворыя павінны ведаць, што даволі часта ў іх можа развіцца трывожная сімптаматыка, парушыцца сон, паступова далучыцца дэпрэсія, што істотна павышае рызыку паўторных інфарктаў. Звяртайцеся да ўрача-псіхатэрапеўта і не займайцеся самалячэннем.

**Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ:** Сапраўды, пасля вострай кардыялагічнай катастрофы амаль у кожнага другога з'яўляюцца псіхалагічныя праблемы і выжывальнасць у такіх пацыентаў у тры разы ніжэйшая. Таму спецыялізаваная дапамога вельмі неабходна, і я сама спрыяю сёння таму, каб у кожным кардыялагічным аддзяленні быў спецыяліст для вырашэння псіхалагічных праблем пацыентаў.

**Ларыса ГАЎРЫЛЕНКА:** На фоне прыёму тых ці іншых прэпаратаў можа развівацца дэпрэсія, а калі кардыялагічны хворы прымае і свае лекі, і антыдэпрэсанты, то рызыкуе атрымаць пабочныя эфекты. У нас захоўваецца міждысцыплінарны падыход, калі вузкія спецыялісты сумесна з тэрапеўтам маюць магчымасць прымаць агульнае рашэнне для кожнага пацыента. Гэта важна, бо, як правіла, большасць лекавых прэпаратаў даследуецца толькі на людзях сярэдняга ўзросту, а найбольш уразлівыя для непажаданых лекавых рэакцый людзі пажылога ўзросту і дзеці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** protas@zviazda.by

# Хто даказаў, што ён не ўтрыманец?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У 2015-м збіралася эміграваць у ЗША, таму кінула працу. Гэта адразу ж прыцягнула да мяне ўвагу, і ў выніку сваякі на мой беларускі адрас атрымалі ліст з інспекцыі Кастрычніцкага раёна г. Віцебска, які сведчыў, што я ўтрыманка, — падзялілася сваёй гісторыяй Рыма. — Каб даказаць, што ў 2015-м я ўжо жыла з мужам у Амерыцы, а не сядзела на шыі ў сваякоў у Беларусі, давялося дасылаць на электронны адрас падатковай адсканаваныя дакументы. Пашпарт з усімі мытнымі штампамі за 2015 год, пасведчанне аб шлюбе, грын-карту, правы кіроўцы з указаннем амерыканскага адраса. Інспектар паведаміў, што гэтага дастаткова, каб даказаць, што ў Беларусі мяне не было, і я не павінна нічога плаціць. Як аказалася, пазбавіцца ад крыўднага ярлыка не так цяжка, аднак не вельмі прыемна, што на цябе яго павесілі. Каб завяршыць справу, засталося толькі атрымаць афіцыйную паперу, што я больш не ўтрыманка.

## Рэдкі спецыяліст

— Я афіцыйна і легальна працую ў Расіі, там жа плачу падаткі, маю сацыяльныя гарантыі і права на пенсію. Але беларускім падаткавікам гэта яшчэ трэба было даказаць. Паміж нашымі краінамі няма мяжы, таму і штампаў у пашпарце аб яе перасячэнні ў мяне няма. Спецыяльных дакументаў на працу і жыццё ў Расіі беларусам не патрабуецца, хіба што трэба мець часовую рэгістрацыю. Каб даказаць, што мяне не было ў Беларусі, звязвалася з падатковай у Мінску загадзя, яшчэ на пачатку 2016-га, як стала вядома пра ўступленне ў сілу закона аб утрыманцах, — успамінае гісторыю збору дакументаў Ядвіга. — Пасля першага тэлефанавання ў мяі мяне папрасілі прывезці даведку з месца працы, дагавор арэнды жылля і рэгістрацыю. Я ўсё прывезла (перыядычна бываю на радзіме, таму час і грошы на гэта дадаткова знаходзіць, на шчасце, не прыйшлося). Аказалася, што рэгістрацыя — гэта расійскі дакумент, і я магу карыстацца ёю, а магу і не. Даведка з працы таксама не давала ўсёй інфармацыі — яна проста канстатавала факт маёй працы (у кампаніі з імем, дарэчы) і пасаду, але не прадстаўляла фінансавых звестак пра мяне... Наступным разам я прывезла яшчэ даведку з бухгалтэрыі з раскладкай па заробку і выплачаных падатках за 2015-ы. Але і гэта не ўсё. Я не маляр, не прыбіральшчыца, не сакратар, у мяне рэдкая спецыяльнасць. Супрацоўнікі падатковай папрасілі напісаць заяву, дзе я падрабязна апісвала сутнасць сваёй працы і тлумачыла, што мая прысутнасць на працоўным месцы на тэрыторыі Расіі патрабуецца ў тым ліку і праз частыя камандзіроўкі па федэрацыі. Каб усё высветліць і зрабіць, спатрэбілася тры візіты ў падатковую. У мяне склалася ўражанне, што супрацоўнікі падатковай працавалі сумленна, каб сабраць максімум маіх дакументаў і больш мяне не турбаваць.

**Дарэчы, дзяржаўная казна папоўнілася ўжо на 13,4 млн рублёў, якія заплацілі грамадзяне паводле патрабаванняў Дэкрэта №3.**

## У цяжкай сітуацыі

Прыведзеныя гісторыі — сведчанне таго, што даказаць сваю грашовую невінаватасць дзяржаве прасцей, калі ты адсутнічаў у краіне ў 2015-м. Калі ж ты знаходзішся ў Беларусі, аднак афіцыйна не лічышся сярод тых, хто працуе, растлумачыць, чаму ты не абавязаны плаціць збор, цяжэй, але таксама рэальна.

Як «Звязда» ужо паведамляла, з 20 студзеня грамадзяне, што трапілі ў разрад сацыяльных утрыманцаў, займелі права на працягу 30 дзён (20 лютага — апошні тэрмін аплаты) прадставіць у падатковую інспекцыю дакументы ці тлумачэнні, якія сведчаць пра адсутнасць у іх абавязку плаціць збор на фінансаванне дзяржаўных расходаў. У сталіцы такім правам скарысталася ўжо каля 18 000 чалавек. Праўда, падлічыць, колькі чалавек ужо ці яшчэ будуць пазбаўлены неабходнасці аддаваць грошы, пакуль немагчыма, бо прадстаўленыя грамадзянамі дакументы яшчэ разглядаюцца. Знаходжанне ў цяжкім жыццёвым становішчы як аргумент для дазволу не плаціць — прычына, якая разглядаецца, у прыватнасці, не ў падатковай інспекцыі, а ў раённых адміністрацыях, дзе для гэтага створаны спецыяльныя рабочыя групы.

— Падатковая працуе ў звычайным рэжыме. Мы разглядаем усе дакументы, якія прадстаўляюць нам нязгодныя плаціць збор. Больш за ўсё тых, хто намагаецца даказаць, што знаходзіўся ў Беларусі менш за 183 дні. Пры гэтым магчымы тры вынікі: першы — пацвярджаецца раней высланае рашэнне, што грамадзянін абавязаны выплаціць збор, другі — поўнае ануляванне гэтага абавязку, трэці — карэкціроўка (як правіла, змяншэнне) сумы плацяжу, — растлумачыла **Галіна ГУРЫНОВІЧ, намеснік начальніка Інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па г. Мінску.** — Грамадзяне, якія фактычна з'яўляюцца плацельшчыкамі збору згодна з Дэкрэтам №3, аднак трапілі ў цяжкае жыццёвае становішча, звяртаюцца ў адміністрацыі раёнаў. Толькі гэтыя ўстановы маюць права вызваліць ад падатку праз акрэсленую прычыну. Такая льгота дзейнічае толькі за 2015 год, бо ў 2016-м сітуацыя ў чалавека можа змяніцца, і яго становішча будзем разглядаць нанова. Грамадзянін можа пісьмова даць тлумачэнні, чаму не павінен плаціць збор, прадставіўшы пацвярджальныя дакументы, што ён знаходзіўся па-за межамі Беларусі больш чым 183 дні. Альбо пісьмова дазволіць падатковай самой запрасіць неабходныя дакументы, напрыклад, калі грамадзянін меў праблемы са здароўем і знаходзіўся ў бальніцы ці на рэабілітацыі.

Па словах спецыяліста, у цяжкай жыццёвай сітуацыі апынуліся, напрыклад, грамадзяне з хранічнымі захворваннямі, якія доўгі час знаходзіліся на лячэнні, а таксама цяжарныя жанчыны, якія нідзе не працавалі. У няпростае становішча трапілі таксама і выпускнікі-платнікі, якія без абавязковага размеркавання скончылі навучальную ўстанову 30 чэрвеня і не змаглі працаўладкавацца да канца года.

— Паколькі спісы плацельшчыкаў збору за 2015 год фарміраваліся Міністэрствам па падатках і зборах Беларусі на падставе звестак, якія розныя ведамствы і арганізацыі прадстаўлялі ўпершыню, то, зразумела, яны маюць шэраг недахопаў, — дадала Галіна Гурыновіч. — У будучыні парадак фарміравання спісаў будзе ўдасканальвацца, і памылак, спадзяёмся, удасца пазбегнуць.

**Ірына СІДАРОК.** sidarok@zviazda.by



■ Кінакрокі

# СЭРЦА ПАВІННА ЗАШЧАМІЦЬ — А НЕ ШЧЭМІЦЬ

## «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ» ПРАДСТАВІЎ НОВУЮ КАРЦІНУ

**Цярністы шлях да гледача ў стужкі «Сляды на вадзе», прымеркаванай да стагоддзя беларускай міліцыі. У 2015 годзе сцэнарый перамог у рэспубліканскім конкурсе кінапраектаў і атрымаў з дзяржаўнага бюджэту належную «намінацыі» суму грошай. Пэўны час праект кідаўся ад аднаго рэжысёра да другога, а калі вызначыўся і здымачны працэс распачаўся, паўстала праблема сціплага бюджэту, з якім прыходзілася выкручвацца, бо фільм усё ж гістарычны, а пасляваенныя гады, у якія адбываецца дзеянне фільма, трэба выбудаваць. У выніку да фільма «Сляды на вадзе», які сімвалічна выйдзе ў пракат 23 лютага, павышаная ўвага, бо гэта адзіны, прынамсі ігравы, фільм, які нацыянальная кінастудыя зняла зняў за мінулы год.**

З вызначэннем рэжысёра фільма «Сляды на вадзе» быў звязаны невялікі скандал. Сцэнарый, які Андрэй Голубеў пісаў «пад сябе» на працягу васьмі гадоў і які ў выніку перамог у конкурсе кінапраектаў, Міністэрства культуры вырашыла аддаць расійскаму рэжысёру Ягору Канчалоўскаму. Сцэнарыст абурыўся, але прадстаўнікі ведамства растлумачылі, што ў конкурсе перамагаюць праекты, а не рэжысёры, таму яны дзейнічаюць «у межах дазволенага». У выніку і з Канчалоўскім не склалася — кажуць, таго не задаволіў прапанаваны ганарар — таму рэалізоўваць ідэю ў выніку даручылі беларускаму рэжысёру Аляксандру Анісімаву, аўтару дакументальных работ і дзіцячага ігравога фільма «Неймавернае перамяшчэнне». Бурнае абмеркаванне, якое выклікала гэта гісторыя, здаецца, гучала яшчэ не так даўно, а прэм'ера шматпакутнага фільма ўжо на носе.

**Дзе павінна быць інтрыга — яе не стае; дзе павінна іграць любоўнае саперніцтва — не іграе; у момант, калі сэрца павінна зашчаміць ад страху, — не шчэміць.**

Сцэнарый заснаваны на рамане доктара гістарычных навук, прафесара Мікалая Ільінскага «Чужыя сярод сваіх», які ў сваю чаргу базуецца на рэальных падзеях. Гаворка ў стужцы ідзе пра пасляваенныя гады, калі беларускія праваахоўнікі змагаліся са шматлікімі бандфарміраваннямі, раскрывалі іх планы, абаранялі насельніцтва, будавалі стратэгіі паводзін, перастрэльваліся, гінулі. Уласна перастрэлкі ў фільме — ці не галоўны элемент. Яшчэ па трэйлеры «Слядоў на вадзе», які мне давялося ўбачыць у кінатэатры перад паказам, я зразумела, што бойкамі стваральнікі ганарацца асабліва, бо ролік, здаецца, імкнуўся ўмясціць іх усе. І калі гэтыя стрэлы пачынаюцца ў самой карціне — пішы прапала, бо галоўнае ў іх не выбудаванасць, а сама наяўнасць і задзейнічанне піратэхнічнага ўчастку «Беларусьфільма».

Значыць, старэйшы лейтэнант Смоліч на сваю бяду прыбывае ў Парэчча, у Заходнюю Беларусь, для папаўнення штату міліцыі, бо бандыты, асабліва банда загадкавага і нікому не вядомага Фрэйшуца, разышліся не на жарт. Тут ён знаёміцца з калегам — начальнікам крымінальнага вышуку Крыкуновым — і яго нявестай Сабінай. У выніку яны ствараюць любоўны трохкутнік, толькі нейкі невыразны, у якім супрацьстаянне выяўляецца толькі ў словах: Смоліч пагаварыў з Крыкуновым, Крыкуноў пагаварыў з Сабінай, а Смоліч Сабіну бачыць толькі ў снах, а ў рэальнасці пасля знаёмства з ёй і не звязваецца. Няўдалая заяўка на стварэнне любоўнай інтрыгі.

Не паспявае галоўны герой прыглядзецца да новага месца працы, участак аказваецца пад абстрэлам, можна меркаваць, бандытаў. Смоліч вымушаны ўдзельнічаць у пошуках Фрэйшуца і змагацца з бандай, якая ў хуткім часе нападае на мясцовы клуб і бярэ ў палон артыстаў тэатра. На экране разыгрываецца цэлая дэтэктыўная гісторыя: міліцыя арыштоўвае параненага бандыта, кіраўніцтва вырашае «ўкараніць» новага супрацоўніка ў банду, у самой структуры выяўляецца здраднік. Прыходзіцца строіць здагадкі, разбірацца, хто ёсць хто ў гэтым заблытаным сюжэце, меркаваць, каму належыць злавесны цень у плашчы з капюшонам а-ля Смерць.





Галоўны недахоп фільма ў непрапрацаваных прычынна-выніковых сувязях: на жаль, не здолелі аўтары накіраваць герояў па матываваным шляху, ад чаго і карціна развальваецца на часткі, так і не прапанаваўшы гледачу нечага выразнага. Невыразнасць, у сваю чаргу, становіцца бічом усіх рэжысёрскіх задум: дзе павінна быць інтрыга — яе не стае; дзе павінна іграць любоўнае саперніцтва — не іграе; у момант, калі сэрца павінна зашчаміць ад страху, — не шчэміць. Таму жанр баевіка, які традыцыйна выціскае эмоцыі і ўпэўнена кіруе ўвагай гледача, у гэтым выпадку адносіцца толькі да формы «Слядоў на вадзе».

Нейкі ўмоўны прыз за работу над фільмам я аддала б мастаку-пастаноўшчыку, бо антураж тут створаны не толькі сімпатычны, але і збольшага пераканаўчы, хоць і відаць, што група абыходзілася сціплымі лакацыямі, максімальна звужала «гарадскую» прастору і разыходзілася на прыродзе, дзе ў кадр нешта нетыповае для пасляваенных гадоў трапіць не магло. Добра на фоне парэччавых сцен глядзіцца сапфіравага колеру форма, цікава ўзнавілі міліцэйскі ўчастак, даволі стылёва паказалі пасляваенную абшарпанасць, для бандытаў пабудавалі казачныя ахайныя зямлянкі.




У стварэнні фільма ўдзельнічалі толькі беларускія прафесіяналы. Ролю Смоліча выканаў акцёр РТБД Арцём Курэнь, вядомы таксама па галоўнай ролі ў фільме «Гараш» Андрэя Курэйчыка, сыгралі тут Пётр Юрчанкоў, Вераніка Пляшкевіч, Таццяна Чардынцава, пераканаўчыя вобразы ваенных начальнікаў атрымаліся ў Ігара Дзянісава, Яўгена Нікіціна, Віктара Манаева.

**Нейкі ўмоўны прыз за работу над фільмам я аддала б мастаку-пастаноўшчыку, бо антураж тут створаны не толькі сімпатычны, але і збольшага пераканаўчы.**

Фільм «Сляды на вадзе» нельга назваць трыумфам «Беларусьфільма». Каментуючы новы баявік (ці дэтэктыў) нацыянальнай кінастудыі можна адчуць дэжавю, таму што роўна тая ж схема — вялікія амбіцыі пры нездольнасці іх увасобіць — згадваецца, напрыклад, у сувязі з апошнімі карцінамі цыкла «Дзяржаўная граніца» альбо грандыёзным праектам «Мы, браты», на якія, дарэчы, выдаткоўваліся дзяржаўныя сродкі.

Усё ў беларускім кінематографе, які звязаны з бюджэтнымі грашыма, заўсёды складана — куча дакументаў, працэдур, тайных матываў. У гэты ж час хібы сферы кінематографа лёгка выкрываюцца простай логікай. Гэта логіка падказвае, што адзіны за год фільм не павінен быць баевіком, а сюжэт не мусіць расказваць пра міліцыю. Першае — таму што гледзячы па мінулым вопыце, дынамічныя жанры ў нас відавочна не атрымліваюцца, другое — таму што праца міліцыі, тым больш пасляваеннай, на мой погляд, не самая вялікая цікавасць для грамадства сёння.

Фільм «Сляды на вадзе» глядзеўся б лепш, калі б быў адным з пяцідзесяці створаных кінастудыяй карцін. Толькі ён адзін і, як ужо гаварылася, абыходзіўся даволі сціплым бюджэтам, таму ўзнікае чарговае лагічнае пытанне: чаму б нашым кінавытворцам не выбіраць жанры па кішэні. Шэраг рашэнняў, пачынаючы з конкурсу кінапраектаў 2015 года, прывёў да абсурднага выніку — кінастудыя эканоміла, але зняла не надта ўдалы баявік да стагоддзя беларускай міліцыі. Не захопіць, на эмоцыю не праб'е, пакіне збянтэжанасць.

А ў гэты час так хочацца, каб нашы акцёры ігралі ў значным кіно. Даўно ўжо кінастудыі трэба пераарыентавацца на тое, што яна зможа адолець, а піратэхнічны ўчастак «Беларусьфільма» пачакае.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Ініцыятыва

# ПАХУЛІГАНІМ?

## Стартаваў трэці этап праекта Movabox

**Гэтым разам галоўным удзельнікам акцыі, якую ладзіць кампанія Velcom дзеля папулярызацыі беларускай літаратуры, стаў паэт-авангардыст і літаратуразнаўца Віктар Жыбуль.**

Праект Movabox не толькі адкрывае новыя імёны і напрамкі сучаснай беларускай літаратуры, але і працягвае сам удасканальвацца. У пацвярджэнне гэтаму ў мультымедыйным фармаце была прадстаўлена новая версія сайта праекта, на якім ужо з сённяшняга дня будзе даступны тэст па творчасці Віктара Жыбуля. Праходжанне задання дае шанц удзельнікам атрымаць у якасці прыза спецыяльную скрыначку з наборам артэфактаў, якія адлюстроўваюць адметныя рысы творчасці паэта. А яго зборнік «Дзяцел і дупло» зусім хутка з'явіцца на паліцах буккросінгу, якія размясціліся ў кавярнях сталіцы і абласных гарадоў краіны.

Спецыяльным госцем мерапрыемства таксама стаў удзельнік папярэдняга этапу Movabox, аўтар кнігі «Дзеці Аліндаркі» — Альгерд Бахарэвіч, які сімвалічна перадаў «эстафету» Віктару Жыбулю.

Пашыраючы літаратурныя гарызонты чытачоў, арганізатары Movabox вырашылі звярнуцца гэтым разам да сучаснай беларускай паэзіі. Мабыць, таму стаць першым удзельнікам гэтага кірунку выпаў гонар паэту Віктару Жыбулю, чые неардынарныя і наватарскія вершы ламаюць усё стэрэатыпныя ўяўленні пра нашу літаратуру і разам з тым адлюстроўваюць рэальнасць праз прызму іроніі і гумару.

«Лепшыя ўзоры класічнай беларускай літаратуры прысвечаны пошукам адказаў на пытанні, якія прынята называць «вечнымі». У творчасці Віктара Жыбуля пытанні таксама прысутнічаюць — але зусім іншыя: нечаканыя, неадназначныя, часам проста забаўныя, а часам нават хуліганскія», — адзначыў кіраўнік аддзела брэнд-менеджменту Velcom Зміцер Курловіч.

Як і ў папярэдніх этапах Movabox, любы жадаючы, які прайшоў тэст на сайце, можа стаць адным з 20 уладальнікаў унікальнай скрыначкі з рэчамі, звязанымі з кнігай пісьменніка. Але што ж захоўваецца ўнутры запаветных скрыначак? А там вы зможаце знайсці набор налепак з персанажамі тэста, значок «Ганаровы хуліган раёна», трафарэт са словам «Адхуліганена», фігурку чалавечка на кнопачцы, якая можа адлюстроўваць настрой свайго гаспадара, і нават абавязковы атрыбут «хулігана» — кулёк семак. А своеасаблівым дапаможнікам у гумарыстычным стаўленні да рэчаіснасці стане, вядома, сама кніга Віктара Жыбуля «Дзяцел і дупло».

«Жыццё, на мой погляд, такая рэч, да якой не заўсёды варта ставіцца занадта сур'ёзна. Кожнаму з нас патрэбны той маленькі гарэза, які ўвасабляе ўменне ўспрымаць нават «дарослую» рэчаіснасць з цікаўнасцю, непасрэднасцю, адкрытасцю. Таму мне так імпануе праект Movabox — у першую чаргу сваім імкненнем абнавіць успрыманне беларускай літаратуры, пазбавіцца ад існуючых у яе дачыненні штампаў і клішэ», — адзначыў Віктар Жыбуль.

**Таццяна АЛБІТАВА**

■ Майстры

# СЛОВА ДА СЛОВА



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## Дом нацыянальных літаратур плануюць адкрыць у Маскве

**Гэту ідэю беларускія аўтары абмеркавалі разам з рэктарам Літаратурнага інстытута імя А.М. Горкага Аляксеем ВАРЛАМАВЫМ у Мінску. Наш карэспандэнт даведаўся, як будзе выглядаць праект і які след застаўся ад беларускіх паэтаў і пісьменнікаў у Літінстытуце.**

### ЗБІРАЕМ НАЙЛЕПШЫХ

«Залаты век» Літаратурнага інстытута — савецкі час, лічыць яго рэктар. «З прафесійнага пункту гледжання, калі Саюз пісьменнікаў СССР быў заснавальнікам і разумеў спецыфіку літаратурнай падрыхтоўкі, умовы былі лепшыя, чым тыя, у якіх мы працуем цяпер». Да таго ж **пісьменнік і гісторык Вячаслаў БАНДАРЭНКА** ўспомніў і «залатыя прыём» — студэнтам, якія прайшлі праз Вялікую Айчынную вайну, было што напісаць з уласнага вопыту. Дарэчы, пэўны час першакурснікам мог стаць толькі той, хто меў двухгадовы досвед працы. Цяпер жа, як і ў астатнія ВНУ, моладзь сюды прымаюць адразу пасля школы. Наколькі гэта правільна... Цяжка сказаць, бо пісьменнікі лічаць, што паэт фарміруецца нашмат раней, чым празаік ці драматург.

— У нетрах інстытута даўно спела ідэя тое добрае, што было тады ў Літінстытуце, паспрабаваць зараз адрадзіць у новых умовах і формах. Змяніць навучальныя праграмы. А сярод таго, што страцілі, — кафедра мастацкага перакладу з моў народаў СССР. Напрыклад, Чынгіз Айтматаў, Расул Гамзатаў з'явіліся дзякуючы Савецкай імперыі, якая несла не толькі кроў і тэрор, але і адукацыю, культуру.

Гэта ідэя ў выніку разважанняў ператварылася ў больш буйны праект — Дом нацыянальных літаратур. Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін яго ўжо падтрымаў, таму існуе вялікая імавернасць, што ён будзе рэалізаваны. «Гэта, з аднаго боку, грамадска-палітычны цэнтр, таму што дружба народаў — важная задача. З другога, — культурна-асветніцкі». Там плануюць зрабіць выдавецтва, магчыма, заснаваць часопіс і майстэрні мастацкага перакладу. Арганізатары хочуць, каб на месцы былой Някрасаўскай бібліятэкі быў пабудаваны сучасны комплекс.

### ЛАДЗІМ СУСТРЭЧУ

Літінстытут разлічвае і на дапамогу беларускіх аўтараў. Падчас візіту Аляксей Варламаў сустрэўся з рэктарам Белдзяржуніверсітэта Сяргеем Абламейкам. На сустрэчы з'явілася ідэя, каб БДУ каардынаваў працу Дома з беларускага боку.

Каб пачаць з канкрэтных спраў, пісьменнікі Беларусі і Расіі могуць разам выпусціць зборнік, альманах ці анталогію. Іншая ідэя — праводзіць сумесныя майстар-класы ці семінары.

### ГАВОРАЦЬ ВЫПУСКНІКІ

Падчас круглага стала аўтары закранулі і рэзанансныя пытанні, напрыклад, ці ёсць для пісьменнікаў забароненыя тэмы. **Паэт Анатоль АЎРУЦІН** гаворыць, што ён не прыхільнік таго, каб аўтар працаваў на мяжы дазволенага. «Літаратар мусіць сваімі творамі паказваць, чаго ён варты, што карае ён у сваёй душы, а заадно — і ў душах чалавецтва».

**Ксенія ВЯЦКАЯ, выпускніца Літінстытута,** расказала сваю гісторыю. «Я не стала пісьменніцай, хоць мне здавалася, што ў 18 гадоў я пісала як геній. Можа, гэта да лепшага. Вядома, мая прафесія цяпер звязана з добрым словам, і я вельмі ўдзячная гэтай адукацыі. Я ёй ганаруся. Мне б хацелася, каб, можа, і мае дзеці туды пайшлі. Калі выпускалася, выкладчыкі захапляліся маёй патрыятычнай прозай пра Беларусь. Я пытаюся ў сваіх аднакурснікаў — ніхто менавіта літаратурай не займаецца. Тут мусіць сысціся вельмі шмат: і талент, і адукацыя».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ У закрытай прасторы

# Галоўнае — пралезці праз дзверы

## Кожны ахвотны змог выставіцца ў «Доме карцін»

**Галерэя «Дом карцін», што станоўча зарэкамендавала сябе пачынаючы з першай выставы і надалей, арганізавала даволі экстравагантны праект: на працягу трох дзён у парадку жывой чаргі прымала ад кожнага ахвотніка па адным творы, які тут жа манціравала ў экспазіцыю. Аўтарам не трэба было даказваць наяўнасць спецыяльнай адукацыі ці казыраць удзелам у міжнародных праектах — работы прымаліся ад усіх. Патрабаванне толькі адно: каб творы пралазілі праз дзверы. Тое, што атрымалася, — выставу жартаўліва назвалі «Я Манэ, Я Шышкін, Я Малевіч» — ужо можна ўбачыць у залах галерэі.**

Акцыя праходзіла з 29 да 31 студзеня, толькі за першы дзень у прастору прыйшло каля трохсот аўтараў, а ў выніку экспазіцыя складаецца з 661 твора мастацтва, як можна здагадацца, абсалютна розных па жанрах і тэхніках. Усе залы галерэі «Дом карцін», такім чынам, занятыя канцэптуальна між сабой не звязанымі работамі, якія прынеслі сюды самі творцы.

**Усе залы галерэі «Дом карцін», такім чынам, занятыя канцэптуальна між сабой не звязанымі работамі, якія прынеслі сюды самі аўтары.**

Ідэя акцыі — не новая, яшчэ ў 1978 годзе яе ўвасобіў легендарны, у тым ліку дзякуючы сваім эксцэнтрычнасці і бунтарству, куратар Уолтэр Хопс, які за сваю працоўную дзейнасць арганізаваў больш як сто мастацкіх выстаў. Нечаканых, незвычайных, дзіўных. Адной з яго ініцыятыў была выстава «36 гадзін», якая прайшла ў альтэрнатыўнай прасторы — Музеі часовага мастацтва (Museum of Temporary Art) у Вашынгтоне. Сам Уолтэр Хопс цягам 36 гадзін сустракаў візіцёраў, прымаў іх творы і адразу ўстаўляў у экспазіцыю. Да ўдзельнікаў было толькі адно патрабаванне — вядома ж, каб творы пралазілі ў дзверы. Адзін хлопец падпісаў змяты, вырваны з часопіса, фотаздымак голай жанчыны і прынёс яго ў Музей, сцвярджаючы, што гэта яго твор, — Хопс у выніку знайшоў кут без падсветкі і сказаў: «Вось выдатнае месца для тваёй работы».

Выстава «36 гадзін» стала цудоўным прыкладам альтэрнатыўнай «дзвіжухі» ў сферы мастацтва і ў нашай сучаснасці, калі куратарская работа ў Беларусі таксама адрываецца ад акадэмічнасці, калі з'яўляецца ўсё больш і больш так званых альтэрнатыўных пляцовак і ў гэты ж час зусім не проста арганізаваць персанальную выставу, такія напрацоўкі прыходзяцца вельмі дарэчы. Прыемна, што тут няма канфлікту прафесійнага і непрафесійнага мастацтва, высокага і іранічнага, вядомага і не.

**Да ўдзельнікаў было толькі адно патрабаванне — вядома ж, каб творы пралазілі ў дзверы.**

Кожны наведвальнік выставы «Я Манэ, Я Шышкін, Я Малевіч» з усёй разнастайнасці прадстаўленых твораў можа выбраць трох фаварытаў. Падлік галасоў у выніку выявіць уладальніка Прыза глядацкіх сімпатый, які атрымае магчымасць правесці ў галерэі «Дом карцін» персанальную выставу.

Экспазіцыю можна паглядзець да 26 лютага.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

# «Першацвет» як пачатак

## Падведзены вынікі конкурсу маладых літаратараў




**10 самых лепшых маладых паэтаў і 10 маладых празаікаў сталі пераможцамі літаратурнага конкурсу «Першацвет». Іх урачыстае ўзнагароджанне адбылося падчас XXIV Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу.**

Конкурс, заклікакы падтрымліваць маладых аўтараў, сёлета праходзіў упершыню. На яго было даслана 160 работ з розных куткоў Беларусі. Пра тое, што ў гэтай ініцыятывы будзе добрая перспектыва, расказаў **намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ:**

— Вельмі прыемна віталь пераможцаў конкурсу «Першацвет», які быў заснаваны Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Выдавецкім домам «Звязда», выдавецтвам «Мастацкая літаратура» пры вельмі творчай, жывой падтрымцы Саюза пісьменнікаў Беларусі. Мне здаецца, што якраз гэты альманах — плён вашай творчай штодзённай работы, якую вы праводзіце разам з натхненнем, разам з вашымі музамі, ствараючы вершы, прозу ці драматургічныя творы. «Першацвет» — гэта слова, якое вядзе да першаснасці, гаворыць пра нейкі пачатак. Мне здаецца, што ў конкурсу з такой прыгожай назвай будзе вельмі цікавая перспектыва. Я ўпэўнены ў гэтым. І што следам за альманахам паўстане сур'ёзная бібліятэка твораў маладых літаратараў. Спадзяюся, многія сёлетнія ўдзельнікі дашлюць свае творы і на другі этап конкурсу, які распачнецца ўжо 1 сакавіка. Найлепшыя творы будуць надрукаваныя не толькі ў альманаху «Першацвет», але і на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», часопісаў «Маладосць», «Нёман» і іншых літаратурна-мастацкіх і грамадска-палітычных выданняў краіны.

Работы маладых аўтараў прайшлі ацэнку прафесійнага журы. Адным з тых, хто вызначаў пераможцаў, быў **галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» паэт Віктар ШНІП:**

— Калі агульны ўзровень дасланых работ ацэньваць па 100-бальнай шкале, то я б паставіў 65. Бо некаторыя ўдзельнікі, напрыклад, дасылалі творы, напісаныя пра вайну, — а ў гэтай тэматыцы сказаць штосьці новае вельмі складана. Іншыя накіроўвалі творы, напісаныя адмыслова для «Першацвету», — і гэта таксама адчувалася. Хацелася б, каб наступны раз маладыя аўтары не рабілі так, а адбіралі самае лепшае з напісанага апошнім часам... Выбрана толькі 10 самых яскравых паэтаў і 10 празаікаў, але насамрэч таленавітай моладзі было нашмат больш — я б адзначыў 30 таленавітых паэтаў і 25 празаікаў, вартых быць надрукаванымі ў зборніку. Конкурс быў адкрытым — імёны ўдзельнікаў не хавалі ад журы, таму мы чыталі як знаёмых, так і незнаёмых нам маладых творцаў. Але калі, напрыклад, мы ведалі некага як добрага аўтара, а на конкурс ён прадставіў не самыя лепшыя свае творы, то, натуральна, ён не стаў пераможцам. Галоўнае, каб у паэзіі адчувалася сапраўднае паэтычнае слова, а ў прозе — мастацкая літаратура.

Цікава, што ў адной з пераможцаў у намінацыі «Проза» Валерыі Саротнік ужо дзве ўласныя кнігі паэзіі! Як той казаў, таленавіты ва ўсім. Яшчэ адна «празаічная» пераможца Аліна Длатоўская — таксама ўжо досыць паспяховы аўтар. Колькі гадоў таму яна заняла першае месца ў намінацыі «Проза» на конкурсе «Брама-Мар». А сёлета ёй прысудзілі другое месца ў конкурсе перакладаў «Зразумей Украіну». У васьмі нумарах часопіса «Бярозка» друкавалася аповесць гэтай маладой аўтаркі «Арнаменты» — фантастычны твор для малодшых падлеткаў.

— Перамога ў «Першацвеце» яшчэ раз даказвае мне, што не трэба нічога баяцца, трэба заўсёды рухацца наперад, рызыкаваць, і рана ці позна ты атрымаеш тое, чаго хочаш, і тое жаданні спраўдзяцца, — расказала **Аліна ДЛАТОЎСКАЯ** карэспандэнту «Звязды». — У пэўным сэнсе я рызыкавала, калі падавала твор на конкурс, бо не была ўпэўнена ў яго якасці — вельмі доўга вычытвала, рэдагавала, перапісвала — і ўсё адно не была спакойная, што зрабіла ўсё, што магла... Часцей за ўсё я пішу ў метро, калі еду на працу. Менавіта там да мяне прыходзіць натхненне і вельмі добра прыдумваецца. Спачатку я занатоўваю на тэлефоне, а начамі перапоўшу ў сшытак ці на камп'ютар. Насамрэч я больш люблю пісаць ад рукі, бо так лепш прадумваеш тое, што пішаш, але цяпер, на жаль, не заўсёды ёсць такая магчымасць.

Літаратурны конкурс для маладых аўтараў сёлета толькі распачынаецца. Наперадзе — шмат новых кніг і новых імёнаў, якія запаляцца на небасхіле беларускай маладзёжнай літаратуры.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

## Уважаемые акционеры ОАО «МАПИД»

**17 февраля 2017 года**

состоится внеочередное общее собрание акционеров

**ОАО «МАПИД»,**

расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205.

Собрание созывается по инициативе Наблюдательного совета ОАО «МАПИД».

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205 (зал заседаний). Начало работы собрания – 17 февраля 2017 года, 14.00.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О внесении изменений в Устав ОАО «МАПИД».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочие дни начиная с 13 февраля по 16 февраля 2017 года по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. №208А (отдел собственного строительства и инвестиций) с 9.00 до 16.00, 17 февраля 2017 года – по месту проведения собрания с 9.00 до 13.30.

Регистрация участников собрания с 12.30 до 13.30 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
— Ведаеце, я калі на мінулым месяцы работы была на пасадзе адміністратара, са скандалам выгнала адну супрацоўніцу. З тых часоў — мы ворагі. Напэўна, гэта яна нас падставіла, — нібы здагадваецца Паліна.



Канчаткова паверыць у невінаватасць дзяўчат перашкодзіла вялікая колькасць SIM-карт, знойдзеная ў кожнай.



Каця любіць чытаць, яе апошні выбар — кніга пад назвай «Экстрэмальныя адносіны».

Я ўжо амаль гатовая шчыра паверыць, што ўся гэтая сітуацыя — недарэчная выпадковасць, але справа даходзіць да агляду асабістых рэчаў. Змесціва сумкі быццам бы не выклікае падазрэнняў, звычайны «жаночы» набор: ключы, навушнікі, памада, гумка для валасоў, аднак у кашальку знаходзіцца доказ таго, што жанчыны ўсё ж такі зарабляюць забароненым рамяством: у кожнай — па вялікім стосе тэлефонных SIM-картак.

— Звычайна прастытуткі мяняюць працоўны тэлефонны нумар раз на некалькі дзён. Тое ж датычыцца і кватэры: часцей за ўсё яны здымаюць яе на суткі. Распаўсюджаная практыка, калі дзяўчаты з перыферыі прыязджаюць у сталіцу ўсяго на некалькі дзён, каб падзарабіць, — адзначаюць супрацоўнікі міліцыі.

Размова заходзіць пра бацькоў.

— Я даўно дарослы чалавек. Мне 26 гадоў! З маці ўжо некалькі гадоў не маю зносін, але хваляваць яе ўсё адно не хачу. За свае ўчынкі я адказваю толькі сама! — павышае голас Кацярына. Відаць, што гэтая тэма яе вельмі моцна кранае.



Прызнаваць сваю віну, як і паказваць твар на камеру, дзяўчаты катэгарычна адмовіліся.

Разбіранні доўжацца дзве гадзіны, пасля чаго дзяўчат адпраўляюць да ўчастковага, ноч ім давядзецца правесці ў ізалятары часовага ўтрымання. Адразу ж на наступную раніцу — суд: як растлумачыў **намеснік начальніка Савецкага РУУС Аляксандр ФІЛІПЧЫК,** згодна з артыкулам 17.5 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях займанне прастытуцыяй цягне накладанне штрафу ў памеры ад шасці да дваццаці базавых велічынь або адміністрацыйны арышт, за паўторнае парушэнне на працягу года — штраф ад трыццаці да пяцідзесяці базавых велічынь або адміністрацыйны арышт.

Супрацоўнікі аддзялення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Савецкага РУУС сталіцы праводзяць падобныя рэйды рэгулярна, некалькі разоў на месяц — затрымліваюць такім чынам каля 15 чалавек. Акрамя таго, правяраюць яшчэ і вулічныя «пункты» з благой славай: іх становіцца ўсё менш, але пакуль яны яшчэ не зніклі канчаткова.

### «Вы паглядзіце на мяне: ува мне 70 кілаграмаў тлушчу! Якая я прастытутка?»

— Большасць сайтаў, на якіх размяшчаюцца анкеты, зарэгістраваны не ў Беларусі, таму досыць складана абмяжоўваць да іх доступ. Так што, калі задацца мэтай... Аднак самі затрыманыя, якія прызнаюць сваю віну, адзначаюць, што з-за крызісу кліентаў усё ж такі стала менш, а дзяўчат, якія прыехалі ў сталіцу з правінцыі за лёгкімі грашыма — больш, — расказваюць спецыялісты.

Уцягнутымі ў прастытуцыю аказваецца жанчыны з розных сацыяльных слаёў і ўзроставых груп. Часта ў анкеце ўпішуць недакладную інфармацыю, прыбіраючы да пары дзясяткаў лішніх гадоў, ці ж загружаюць чужыя фотаздымкі. Так што цалкам магчыма, што замест юнай стройнай німфы на месцы вас будзе чакаць жанчына «з формамі», блізкая да перадпенсійнага ўзросту. Але тут ужо нічога не зробіш: назваўся груздом — лезь у кош.

Усяго летась у Мінску было складзена 619 адміністрацыйных пратаколаў. 207 асоб панеслі пакаранне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, астатнія — заплацілі штраф агульным памерам у 176 тысяч 855 рублёў. На цяперашні момант на аператыўным уліку стаіць каля тысячы чалавек.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Дар'я КАСКА.** *kasko@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, 15. Тел. +375 17 256 90 05 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт и спецтехника, расположенные по адресу:**
г. Минск, ул. Гурского, 16а и г. Кричев, ул. Комсомольская, 103а, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 218 | Кран КС 357721 (рег. знак АА 6063-7) | 6 362,23 | 318,11 |
| 2 | 223 | Кран РДК 250-3. 1990 г. в. | 17 406,09 | 870,30 |
| 3 | 455 | Автомобиль МАЗ-544008 (рег. знак АВ 7513-7), 2007 г. в. | 7 442,61 | 372,13 |
| 4 | 268 | Полуприцеп ПЛ 12-12 (рег. знак 2892 АА-7), 1992 г. в. | 1 680,59 | 84,03 |
| 5 | 131 | Прицеп ПЛ-12-12 (рег. знак 2949 КА), 1992 г. в. | 1 680,59 | 84,03 |
| 6 | 700 | Автомобиль МАЗ-437041 г/н 8078 АА-1 (рег. знак АА 8078-1), 2007 г. в. | 5 281,85 | 264,09 |

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон +375-29-654-92-93 |

**Транспорт и оборудование, расположенные по адресу:**
г. Гродно, ул. Индустриальная, 2а, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 7 | 456 | Грузовой специальный бетоносмеситель МАЗ 630305-249 СМБ-270 (рег.знак АВ 7826-7), 2007 г. в. | 17 320,31 | 866,02 |
| 8 | 778 | Грузовой автомобиль бортовая платформа «UAZ 3303», 1987 г. в., АВ 8762-4, кузов №087856 | 1 021,94 | 51,10 |
| 9 | 619 | Модульная автозаправочная станция | 840,00 | 42,00 |
| 10 | 893 | Сварочный аппарат «Оливер» ВД-350, 2013 г. | 1 596,00 | 79,80 |

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Марчик Петр Иванович, зам. председателя ликвидационной комиссии по филиалу СУ-110, контактные телефоны: 8-0152-530-712 (716, 728) |

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:**
г. Гомель, ул. Барыкина, д. 254 в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 11 | 150081 | Автомобиль УАЗ-3303-018, рег. №АВ 3985-3 (1994 г.в.) | 2 123,10 | 106,16 |
| 12 | 150084 | Грузовой специальный кран с гидравлическим приводом КС-4572, (1988 г.в.) | 8 474,40 | 423,72 |
| 13 | 930 | Автомобиль грузовой бортовой МАЗ (MAZ) 53371 (1990 г.в.) | 1 801,80 | 90,10 |
| 14 | 998 | Автобус вагон ГАЗ (GAZ) – 2705 (2000 г.в.) | 1 467,95 | 73,40 |
| 15 | 150033 | Грузовой седельный тягач МАЗ (MAZ) 543205-226 (2007 г.в.) | 8 474,40 | 423,72 |
| 16 | 150032 | Грузовой седельный тягач МАЗ (MAZ) 543205-226 (2007 г.в.) | 8 474, 40 | 423,72 |
| 17 | 892 | Полуприцеп панелевоз 1ПП 12 7,5 (1986 г.в.) | 1 334,85 | 66,74 |
| 18 | 150044 | Полуприцеп платформа-панелевоз МАЗ (MAZ) 998500 (2007 г.в.) | 5 605,05 | 280,25 |
| 19 | 150035 | Полуприцеп бортовой МАЗ (MAZ) 938662-043, 2007 г.в. | 3 870,35 | 193,52 |
| 20 | 150021 | Станция компрессорная передвижная ПКСД-5-25 ДМУ 1 | 2 335,30 | 116,77 |
| 21 | 501 | Ножницы листовые металлические НД3318Б | 3 269,75 | 163,49 |
| 22 | 1008 | Подъемник К-1В с электролебедкой | 500,50 | 25,03 |

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00 по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254. Ответственное лицо: Дриневский Виктор Васильевич, производитель работ, контактные телефоны: +375 29-603-49-02 (Velcom), 8-0232-46-09-03 |

**Транспорт и оборудование, расположенные по адресу:**
**г. Брест, ул. Гродненская, д. 55Д** в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 23 | 804 | Легковой автомобиль GAZ-31105, 2007 г.в. | 748,08 | 37,40 |
| 24 | 373 | Подмости ПВС 12, 1979 г.в. | 5 818,43 | 290 92 |
| 25 | 242 | Преобразователь частоты ПЧ-4/42-200У2 (2010 г. в.) Pfaff Silberblau Германия | 448,80 | 22,44 |
| 26 | 36 | Станок вертикально-сверлильный 2С132 (1990 г. в.) | 3 225,62 | 161,28 |
| 27 | 997 | Тележка гидравлическая (PFAFF 20-115) (2010 г. в.) Pfaff Silberblau Германия | 265,25 | 13,26 |
| 28 | 400 | Мойка холодной воды (FTS 190) (2010 г. в.) IP Cleaning S.p.A. Italy | 290,40 | 14,52 |

**Спецтехника, распложенная по адресу:**
**г. Брест, ул. Янки Купалы,120/2** в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 29 | 734 | Автогидроподъемник ВС222-01 на базе ЗИЛ -131 | 7 811,06 | 390,55 |

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, контактный телефон +375 296592523 |

**Транспорт и спецтехника, расположенные по адресу:**
**г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 78а** в составе:

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 30 | 424 | Автомобиль ГАЗ 5312 (рег. знак ТМ 9810, г.в. 1990) | 905,57 | 45,28 |
| 31 | 590 | Автомобиль МАЗ 543205-226 (рег. знак ТС 0153, г.в. 2007) | 6 131,42 | 306, 57 |
| 32 | 4098 | Блок контейнер БК-1, 2014 г. | 2 146,00 | 107,30 |
| 33 | 4097 | Блок контейнер БК-1, 2014 г. | 2 146,00 | 107,30 |
| 34 | 596 | Подмости б/у | 2 971,38 | 148,57 |
| 35 | 633 | Подмости передвижные электрические ППЭ-12.01.А | 4 386,32 | 219,32 |

**Изолированное помещение, расположенное по адресу:**
**г. Могилев, пр-т Пушкинский, 63**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 36 | Встроенное помещение | Помещение неустановленного назначения | 190 кв. м | 700/D-95849 |

| | |
|---|---|
| Начальная цена с НДС 20% | **66 789,49 белорусских рублей BYN** |
| Шаг аукциона: | **3 339,47 белорусских рублей BYN** |

**Условия аукциона:** Покупатель обязан предоставить Продавцу административные помещения согласно прилагаемому плану помещений в безвозмездное пользование, на период с момента перехода права собственности на предмет аукциона к покупателю до момента ликвидации Продавца. С планом помещений, подлежащих передаче Продавцу в безвозмездное пользование, можно ознакомиться на сайте Организатора торгов WWW.CPO.BY

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Куткович Александр Александрович, производитель работ, +375 29 246 68 24. Жаглевский Дмитрий Давыдович, зам. председателя по ликвидационной комиссии по филиалу СУ-86, контактный телефон +375 29 601 62 44 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №1-35** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи.
**По лоту №36** не более 30 (тридцати) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении повторного аукциона опубликовано по лотам №1-7,9-10,12-36 в г. «Звязда» 10.01.2017 г., по лотам №8, 11 в газете «Звязда» 29.11.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **27.02.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Харьковская, 15, 3-й этаж, ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж».** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **23.02.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | СООО «Ярд-Холл», г. Брест, ул. Интернациональная, 40 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Незавершенное законсервированное капитальное строение (Магазин промышленных товаров)** | Здание специализированное розничной торговли | 3066,6 кв. м | 100/U-65825 | Брестская обл., г. Брест, ул. Интернациональная, 40 |

| | |
|---|---|
| **Примечания** | Процент готовности - 77 %, площадь застройки - 1389 кв.м. |
| **Составные части и принадлежности** | Подвал, забор |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0,2945 га, предоставлен Продавцу на праве аренды для обслуживания здания цеха по 31.01.2110 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **415 200,00 белорусских рублей (BYN). Снижена на 60%** |

**Задаток 20%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

После подписания договора купли-продажи Предмета аукциона покупатель в течение пяти банковских дней перечисляет на счет продавца 100% цены продажи Предмета аукциона (с учетом суммы перечисленного задатка), без заключения договора залога.
В 5-дневный срок после поступления на счет продавца цены продажи Предмета аукциона Продавец передает, а Покупатель принимает Предмет аукциона, о чем составляется передаточный акт.
Вопросы, связанные с расчетами по коммунальным платежам, за электроэнергию и т.п., стороны согласовывают при подписании договора купли-продажи Предмета аукциона.
Расходы, связанные с составлением, оформлением, удостоверением договора купли-продажи Предмета аукциона, а также расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем права в соответствии с действующим законодательством, в том числе расходы по уплате пошлины, несет Покупатель. Указанные расходы не включаются в цену продажи Предмета аукциона.
Договор купли-продажи Предмета аукциона заключается после предъявления Покупателем копий платежных документов о перечислении Организатору аукциона вознаграждения и суммы затрат, связанных с его организацией и проведением, указанной в протоколе о результатах аукциона в установленном порядке

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» в номере от 26.01.2017 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **28.02.2017** в 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.02.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## об открытом аукционе по продаже имущества Новогрудского районного унитарного предприятия жилищно-коммунального хозяйства 14 марта 2017 года

| | |
|---|---|
| Вид аукциона | Открытый |
| Предмет аукциона | Изолированное помещение с инвентарным номером 430/D-24223 (назначение – квартира) площадью 39,4 кв. м. Год постройки – 1938. Состоит из жилой комнаты 23,7 кв. м, кухни 15,7 кв. м, веранды 3,3 кв. м. Фундамент – б/бетонный, стены – брус, обшитый вагонкой, печное отопление, водопровод, канализация отсутствует |
| Начальная цена продажи | 4 638,92 рублей (с учетом НДС 20%) |
| Кадастровый номер земельного участка и вид вещного права | **424350100001002313,** право аренды |
| Месторасположение земельного участка | Гродненская область, Новогрудский район, г. Новогрудок, ул. Тимирязева, д. 9 |
| Размер земельного участка | 0,1174 га |
| Продавец | Новогрудское районное унитарное предприятие жилищно-коммунального хозяйства, Гродненская область, г. Новогрудок, ул. Котовского, д. 30, тел./факс: 22472, 22952 |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546 |
| Дата проведения аукциона | 14 марта 2017 года |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 |
| Дата и время начала приема документов | 13 февраля 2017 года 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 7 марта 2017 года 17.00 |
| Сумма задатка | 463, 89 рублей |
| Шаг аукциона | 5% |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости». **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

# ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | Лот №1 – Автомобиль ВАЗ 21144 110 22, легковой хэтчбек, 2007 г. в., цвет: серебристый металлик, стоимостью – 1037,00 белорусских рублей.<br>Лот №2 – Автобус ПАЗ 32053, вагон, 2006 г. в., цвет: бело-зеленый, стоимость – 4129,00 белорусских рублей.<br>Лот №3 – Автомобиль МАЗ 53371, грузовой, бортовой,1991 г. в., цвет: бежевый, стоимость – 979,00 белорусских рублей.<br>Лот №4 – Автомобиль ЗИЛ ММЗ15021, грузовой самосвал, 1986 г. в., цвет: синий, стоимость 541,00 рублей.<br>Лот №5 – Прицеп МАЗ 8926, бортовой, год выпуска неопределен, цвет: голубой, стоимость – 333,00 белорусских рублей |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Отделочник-28 г. Полоцк» |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Полоцк, ул. Суворова,1а |
| Обременения | Обременений нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Полоцк, ул. Успенская, 2, каб. 18<br>24.02.2017 в 11.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка: 211400, г. Полоцк, ул. Успенская, 2, каб. 18, (opi_polotsk@mail.ru)<br>тел./факс (80214) 44-28-42, зам. начальника отдела – Казакова Жанна Васильевна, тел. (80214) 44 21 59, (8-033) 687-90-33, начальник отдела – Лисова Людмила Геннадьевна, (80214) 42 64 98 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка р/с 3642903000517, ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 216, г. Полоцк, код 648, УНП300002505, не позднее 17.00 23.02.2017. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009, №232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

# ОБЪЯВЛЕНИЕ о повторных торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1. Трактор МТЗ 82.1, 2004 г.в., гос. №ВА 4008, б/у, состояние условно-пригодное, начальная стоимость лота 3055,14 белорусских рублей.<br>Лот №2. Автомобиль МАЗ 533603-220, 2007 г.в., гос. №АА 8346-2, б/у, состояние удовлетворительное, начальная стоимость лота 7095,33 белорусских рублей.<br>Лот №3. Автобус НЕМАН, 2008 г.в., гос. №АВ 6240-2, б/у, состояние условно-пригодное, двигатель неисправен, начальная стоимость лота 4014,45 белорусских рублей |
| Собственник (владелец) имущества | Открытое Акционерное Общество «Кохановский льнозавод» |
| Местонахождение имущества | Витебская область, Толочинский район, д. Зеленый Бор. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к Коваленко Федору Николаевичу, тел. 8 (02136) 24185 |
| Наличие обременений | Не имеется |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома.<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4.<br>09 марта 2017 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома.<br>210015, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4.<br>Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24.<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала №200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 15.00 07 марта 2017 года.<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 №232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |




# Зялёная школа

Хата нашых бацькоў стаяла на хутары, каля самага лесу. І адтуль усе трое мы хадзілі ў школу.

Зрэшты, на той час старэйшыя брат і сястра яе ўжо скончылі, а я пайшла ў чацвёрты клас і вучылася добра... У адрозненне ад Колі. Ён двоечнік быў яшчэ той. (А чалавекам, між іншым, стаў добрым. Ва ўсякім разе, калі нехта нашай маме зайздросціў: маўляў, усе твае дзеці з дыпломамі, то яна заўжды адказвала, што інстытуты — гэта, вядома ж, добра, але і на Колю паглядзець — дык толькі пацешыцца, бо і трактар у яго, і конь, бо ён сваёй матулі і бульбачку пасадзіць, і дроўцаў прывязе... Вось і думай пасля гэтага, што лепей для бацькоў — тыя дыпломы ці дзеці побач.)

Гэта, аднак, лірычнае адступленне, гэта — нагода, каб сказаць, што і без дыплома чалавекам быць можна і трэба.

...А вось вучыцца той Коля зусім не хацеў, школу часта прагульваў. Пра яго тады казалі, што ён у нейкую «зялёную» ходзіць.

Я ўсё думала: ну дзе ж яна можа быць, бо ў лес — у грыбы ды ягады — мы з бабай Маняй хадзілі, але ж ніякай школы ніколі не бачылі. «Мусіць, яна недзе ў гушчары стаіць, — думала я. — А зялёнай называецца, бо так пафарбаваная...»

Ну цікава ж было паглядзець! А вось як гэта зрабіць?

Спытала ў Колі. Ён хіба зачырванеўся ды дурніцай абазваў...

«Ну і няхай, — я сама сабе думаю, — дурніца дык дурніца, але ж не настолькі, каб тую школу не знайсці!»

З вечара ў той дзень я падрыхтавала зялёную ў белыя гарохі сукенку, з раніцы прыбралася ў яе і пайшла даследаваць бліжнія гушчары.

Школы нідзе не было.

Прыйшлося вярнуцца дадому (зранку бацькі на працы) — узяць веласіпед.

Ён у нас амаль новенькі быў: старэйшай сястры купілі. Тая ў Ленінградзе на эканаміста ўжо вучылася, а на веласіпедзе на практыку ездзіла ў суседні калгас. Дарослая. Бацькі яе прыбіралі...

На шафе я згледзела новыя Тоніны боты. Яны мне, вядома ж, вялікія былі, але з футрам унутры, белыя, прыгожыя... Я абулася.

Дастала з шафы і Тоніну ружовую камбінашку. Зноў жа яна мне завялікай была, але я ўсё роўна надзела... Потым выцягнула веласіпед і паехала так у лес: што праўда — недалёка зусім, бо на веласіпедзе ланцуг зваліўся.

Начапіць яго я, вядома ж, не магла, таму кінула веласіпед у лесе, а сама прыбегла дамоў.

Толькі ў хату — следам, бачу, тата на абед, а я не ў школе... І ўцячы не паспяваю. Таму дзверы на зашчапку, а сама «пад венік».

Тата пастукаў — ніхто не адчыняе. Ён подбегам да суседняй хаты, да бабы Мані. Кажа ёй:

— Мусіць, злодзей у хаце? Ты нікога не бачыла?

— Не...

І ў двор яны, удваіх. Я тым часам дзверы адчапіла — і ў лес. А ў хаце, як той казаў, карціна Рэпіна «Не чакалі»: ровара няма, шафа расчынена, Тоніны боты зніклі... Значыць, былі такі злодзей?!

Да міліцыі, дзякуй богу, справа не дайшла, бо дзеці якраз са школы вярталіся.

— А чаму сёння Каці на ўроках не было? — пытаюць у таты.

— Як не было? — спалохаўся той. — А дзе ж яна?

І давай мяне клікаць.

Нічога, карацей, не заставалася, як выйсці з узлеску.

Тата, убачыўшы мяне, зрабіўся вельмі злы і перацягнуў такі па мяккім месцы дзяжачкай (першы і апошні раз у жыцці). Але ж гэта было толькі паўбяды, а ўся яна ў тым, што дзецям, якія праходзілі міма, тата казаў:

— Зайдзіцеся, паглядзіце — мая Каця ўжо як Коля. У зялёную школу ходзіць.

Мне было вельмі сорамна і вельмі крыўдна, бо я, дурніца, шукала школу, якой насамрэч не існавала: так проста гаварылі пра дзяцей, якія не хочуць вучыцца.

— Калі і ты, дачушка, з такіх, — сказаў тады тата, — то мне за цябе будзе вельмі сорамна!

Гэтыя словы назаўсёды запалі ў маю памяць. І на працягу далейшага жыцця я рабіла ўсё, каб тату з мамай ніколі не даваліся чырванець за мяне, каб наадварот — яны мной толькі ганарыліся.

...А веласіпед потым мы знайшлі на тым самым месцы, дзе я яго і кінула. І боты мама памыла так, што сястра і не заўважыла, што іх абувалі.

**Кацярына Будзіловіч,**

*г. Скідаль.*

# Надзея памірае апошняй

Дзіцячы розум — гэта адно, дзіцячая памяць — іншае. У трыццатыя гады мінулага стагоддзя я, напрыклад, малы яшчэ быў, але ж цудоўна памятаю сваю вёску — хаткі з падслепаватымі акенцамі ды саламянымі стрэхамі, страшэнную беднату... Людзі ў нашым калгасе «Авангард» працавалі за «палачкі», звычайнай газніцы рады былі! Ні пра электрычнасць, ні пра нейкае радыё нават не чулі.

Але ж усе спадзяваліся на лепшае, жылі адной грамадой: разам працавалі, разам выжывалі. У кожнага на падворку было багата жыўнасці, кожны стараўся нешта прынесці з лесу і блізкай ракі. А ўжо потым, пасля працоўнага дня, ці не ўсе вяскоўцы недзе збіраліся (на лаўцы, на прызбе, у зімовыя вечары — у некага ў хаце), абменьваліся навінамі, абмяркоўвалі планы, успаміналі, жартавалі.

Такія вось вячоркі досыць часта адбываліся ў нас, бо людзі вельмі цягнуліся да ведаў, а мой тата па тым часе досыць адукаваны быў. Ён заўсёды выпісваў газеты, купляў па магчымасці кнігі і потым уголас чытаў тое ж «Уваскрэсенне», «Хаціну дзядзькі Тома»...

Але ж больш за ўсё вясковым мужыкам падабаліся прыгоды Швейка. Дагэтуль у памяці, як дарослыя дзядзькі тады прагна слухалі, як залівіста рагаталі, як жыва абмяркоўвалі, чаго там больш — праўды ці выдумкі?

Дзядзька Віктар, удзельнік Першай сусветнай, бажыўся, што праўды, бо яно ж на фронце чаго не бывае! А для таго, каб яму паверылі, неяк выдаў:

— Я вось пра сябе раскажу.

І пачаў ён так:

— Ну вы ж ведаеце, я ў вайну ў артылерыі служыў, быў наводчыкам гарматы. «Горла» ў той — нібы цэбар без дна, снарады — велічынёй з падсвінкаў: іх двое салдат ледзь падносілі. Але ж як зарадзім, як жахнем — вораг аж калоціцца там!

Дык вось. Вядзём мы неяк агонь па іхніх пазіцыях. Бабах ды бабах — ад нашых стрэлаў аж зямелька дрыжыць. Але ж во бяда — скончыліся снарады! А ў ворага навалам іх. І ён давай смаліць па нас. Галавы не падняць — снарады адзін за адным... І тут я падумаў: а чаму б не схітрыць? Развярнуў гармату, і што вы думаеце: іхні снарад тут жа ў наш ствол! Мы яго зноў на 180 градусаў — і ў адказ ба-бах! Адзін раз так, потым другі, трэці... Выбілі ворагаў... іхнімі ж снарадамі!

Не паспелі ачомацца, дух перавесці, на батарэю генерал прыязджае, дае каманду ўсім выйсці на пляц, пастроіцца, а потым загадвае:

— Салдат Парамон! Выйсці са строю!

— Ёсць! — кажу.

У струнку выцягнуўся, руку да скроні прыклаў.

Ён у той жа міг:

— За салдацкую кемлівасць, за адданасць цару і Айчыне аб'яўляю падзяку і прадстаўляю да ўзнагароды Георгіеўскім крыжам!

Аб'явіў вось так, а потым, ужо цішэй, дадае:

— Просьбы нейкія ёсць?

Я вазьмі ды і ляпні:

— Спадар генерал! Ці трэба мне гэны крыж? З яго ж лямеш да плуга не зробіш. А вось каб мне пасля вайны ды якога каня... Калі, вядома ж, выжыву...

— А ты, салдат, пастарайся, — смяецца генерал. — Будзе табе конь!

— Можа, таму я і выжыў, — скончыў расказ дзядзька Віктар.

— Але ж нешта я не помню, каб ты з вайны на кані вярнуўся? — падкузьміў яго дзядзька Якуб. — Ну праўда ж: на сваіх дваіх прытэпаў.

— Так, браткі, на сваіх... А чаму? Таму што нас, кемлівых салдат, на фронце дай божа было, а генералаў — мала. Вось і забыўся мой пра сваё абяцанне. Але ж мо яшчэ ўспомніць?

Надзея памірае апошняй.

**Яўген Звярынскі,**

*в. Касцяшы, Уздзенскі раён.*

# Залатая жонка? Залаты мужык!

Даўно заўважана, што мужчыны, добра ўзяўшы на грудзі, сваіх жонак звычайна ганяць: скардзяцца тады, як яны іх дасталі, як выпілі кроў, сапсавалі жыццё...

У гэтым сэнсе ў маёй сяброўкі муж зусім не такі. Ён наадварот, як толькі падап'е, пачынае ёй дыфірамбы пець, прызнавацца ў каханні. І, галоўнае, як цвярозы — з яго слова не выцягнеш, бо чалавек ён досыць ціхмяны. А тут такія прыгожыя эпітэты, такія параўнанні!.. Кажа, што кахаў і кахае, што цяпер — "як тады"... Нават больш!..

Быў выпадак — неяк пад гэтую «раздачу» прызнанняў і мяне ў хату прынесла. Чаго толькі не пачула тады.

— Ты ці ведаеш, — пачаў Аляксей, — якая жонка ў мяне? Ды такіх у свеце няма! Яна адна, мая залатая!.. Ты вось думаеш, што ёй лёгка са мной? Не, даражэнькая, памыляешся! Характар у мяне — паганы-паганы! З *такім* мужыка і чатыры жонкі не знеслі б: на развод падалі б. А мая, бач, жыве... Каторы гадок... Адна за тых чатырох пакутуе! Рэдкая жанчына! А ўжо ж гаспадыня...

Не, не хлусіць гэты чалавек і зусім не перабольшвае: жонка ў яго і сапраўды наймілейшая!

Якраз ад яе і вось гэта гісторыя — на тэму прызнанняў.

Значыць, у мужа на працы завядзёнка такая — разам адзначаць вялікія царкоўныя святы. А перад гэтым, адпаведна, скідвацца, купляць нешта з напіткаў-наедкаў, накрываць «паляну»... Аляксей, дарэчы, туды з піражкамі прыходзіць: жонка напярэдадні іх напячэ, прыгожанька запакуе і з сабою дасць.

Дык вось, пасядзелі тыя мужыкі, выпілі, з'елі піражкі, пагаманілі. «Пад градусам», у добрым гуморы разышліся па хатах, па сем'ях.

Аляксей таксама прыйшоў і (да бабкі не хадзі) пачаў жонцы асанну спяваць, пра любоў гаварыць. Яна па гаспадарцы ўпраўляецца, а ён побач ходзіць — любуецца ды расказвае, якая ж яна ўмелая! Тая ўсё парабіла, села вячэраць — ён кампліменты ёй рассыпае, кажа, якая прыгожая. Тая, прытаміўшыся, спаць лягла, а муж не сціхае...

Іншая, можа, і качалку ўжо ўзяла б (і не для таго, каб піражкоў напячы), а гэта быццам слухае (адна за чатырох!), пачынае драмаць, прачынаецца... Пытае нарэшце:

— Ты ўгамонішся сёння ці не? Аж галава ўжо трашчыць ад тваіх прызнанняў.

— Праўда? І што — моцна баліць? — трывожыцца гаспадар. — Можа, ціск падскочыў? Із мя на дурныя жарты. Ты пацярпі крыху... Не хвалюйся: я зараз у морг пазваню — яны мігам прыедуць і цябе забяруць.

— Куды? — смяецца жонка.

Тут да мужа даходзіць, што не тое ён ляпнуў, што «хуткая» і «морг» — гэта (ён механікам працуе) прыкладна як рамонт і спісанне. Ён таксама пачынае смяяцца, потым прабачацца, шкадаваць...

І — скажу вам — словы насамрэч лечаць: боль адступае. Жонка на мужавым плячы ціха засынае, бо ён жа ў яе таксама залаты — ды яшчэ і лекар.

**Соф'я Кусянкова,**

*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**ЗАМЕСТ ПАСЛЯСЛОЎЯ.**

*«Атрымаўшы і насамрэч вельмі цёплыя падарункі ды ганаровы дыплом пераможцы звяздоўскага конкурсу на самую лепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю, я, — паведамляе спадарыня Соф'я, — палічыла сябе абавязанай... тэрмінова напісаць гэту «байку». Па-першае, для таго, каб выказаць падзяку ўсім, хто ацаніў мае творы. А па-другое, каб дапамагчы чытачам, каб падказаць ім, што для напісання цікавых гісторый не трэба шукаць сякеру пад лаўкай, не трэба нешта выдумляць. Дастаткова проста назіраць за жыццём ды час ад часу запісваць. Задорнаў, напрыклад, пачуў у свой адрас: «Я вас так паважаю, так паважаю... Зараз жа пайду ў царкву і пастаўлю там свечку — на памін душы...» Ну хіба ж гэта не смешна?!*

*Вось і мне ў сувязі з перамогай адна з вельмі мілых жанчын пажадала поспехаў. А яшчэ — узысці на... Галгофу. На ўвазе меўся, відаць, Алімп? Але ж і там гара, і там...»*

*То ўсім — і шчыра — удалага ўзыходжання!*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

*dounar@zviazda.by*


## ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов**

23.03.2017 г. в 10.00 по адресу:

Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

| № п/п | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка | д. Хоружинцы, ул. Лесная, 13, кадастровый номер 623288016101000064 | д. Коммуна, ул. Садовая, 4А, кадастровый номер 623288008101000033 | д. Серпищено, У-1, кадастровый номер 623288014101000036 |
| Площадь земельного участка | 0,1285 га | 0,2339 га | 0,1958 га |
| Наименование инженерных сетей | | подъездные пути удовлетворительные | подъездные пути удовлетворительные |
| Начальная цена (бел. рублей) | 2 480 руб. 88 коп. | 3 871 руб. 45 коп. | 2 386 руб. 63 коп. |
| Задаток (бел. руб.) | 496 руб. 18 коп. | 774 руб. 29 коп. | 477 руб. 33 коп. |

Задаток перечисляется на р/с №3600619171104 «АСБ Беларусбанк», код 795, УНП 600181536, ОКПО 04431642 Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится 23.03.2017 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 18.03.2017 г. (последний день подачи заявления 17.03.2017 г. до 17.00) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, 57 4 99.



## Уважаемые акционеры ОАО «Управление механизации № 88»!

31 марта 2017 года в 15-00 по адресу : г. Минск, ул. Промышленная, 23, 3-й этаж состоится годовое собрание акционеров.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2017 год.

2. О результатах аудиторской проверки и отчет ревизионной комиссии по результатам финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.

3. Рассмотрение и утверждение годовой бухгалтерской отчетности и направления использования чистой прибыли за 2016 год. О выплате дивидендов.

4. Утверждение направлений использования чистой прибыли, полученной в 2017 году. Периодичность выплаты дивидендов за 2017 год.

5. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

7. По результатам рассмотрения деятельности Общества за 2016 год рассмотреть вопрос о принятии решения по применению процедуры экономической несостоятельности (банкротства) в соответствии со ст. 13 Закона Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

С материалами, подготовленными к собранию, а также с информацией о деятельности Общества за 2016 год можно ознакомиться: в рабочие дни (понедельник-пятница) с 20 марта 2017 года по 31 марта 2017 года по месту нахождения Общества (3-й этаж) с 9-00 до 16-00.

Регистрация участников собрания с 14-00 до 14-45 по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 11 марта 2017 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100097541 Наблюдательный совет.

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** Скунс. Арда. Аркан. Ікол. Нанду. Абух. Малы. Баба. Ікс. Роў. Шпала. Чаша. Драма. Бяда. Перанос. Амар. Нага.

**Па вертыкалі:** Куркума. Сена. Агіда. Дно. Анёлак. Куб. Ліхаманка. Абіўка. Барыш. Сіла. Парта. Лямпа. Чабан. Аер. Яна. Дог. Аса.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.37 | 18.11 | 9.34 |
| Віцебск — | 8.30 | 17.57 | 9.27 |
| Магілёў — | 8.27 | 18.01 | 9.34 |
| Гомель — | 8.20 | 18.02 | 9.42 |
| Гродна — | 8.52 | 18.27 | 9.35 |
| Брэст — | 8.48 | 18.31 | 9.43 |

## Месяц

*Поўня ў 3.32.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

*Пр.* *Герасіма, Івана, Ігната, Канстанціна, Лукі, Рамана, Якава.*
*К.* *Бажэны, Марыі, Альгерда, Люцыяна, Рыгора.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Мужыкам на заметку: калі на вашу, быццам бы звычайную, жанчыну, гроша ідзе як на прыгожую, значыць, яна разумная.**

У рэстаране.
— А вашы катлеты дакладна з рабчыкаў?
— Ну, увогуле, так. Праўда мы дадаем у іх і іншае мяса.
— Якое?
— Свініну.
— А прапорцыі?
— 50 на 50. Адзін рабчык — адна свіння.

**Пакуль у продажы ёсць сасіскі, яйкі і пельмені — халасцякі так проста не здадуцца.**

— Сынок, ды не злуйся ты, калі мама цябе лае!
— Але ж яна не мае рацыі!
— Гэта, сынок, трэніроўка перад вяселлем.

**Хто не курыць і не п'е — па дамах усіх развязе!**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

## Ну і ну!

### НЕБЯСПЕЧНАЯ «ПАЛЯНКА»

**У сталіцы 61-гадовы мужчына, у мінулым урач-псіхіятр, у сябе дома вырошчваў псілацыбінавыя грыбы.**

Апошнія змяшчаюць галюцынагенныя рэчывы, а іх вырошчванне заканадаўча забаронена. У сябе дома пенсіянер арганізаваў сапраўдную лабараторыю, дзе было ўсё неабходнае для вырошчвання грыбоў. У кватэры аператыўнікі знайшлі і канфіскавалі больш за 115 грамаў сухіх грыбоў, а таксама 15 грамаў марыхуаны, трансфарматар, кампрэсар, насенне, угнаенні. Мужчына растлумачыў, што вырошчваў грыбы як для сябе, так і для збыту.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

Даты | Падзеі | Людзі

### 11 ЛЮТАГА

**1807** год — 210 гадоў таму нарадзіўся (в. Варацэвічы, цяпер у Іванаўскім раёне) Напалеон Орда, кампазітар, піяніст, педагог, мастак. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Польшчы. Удзельнічаў у паўстанні 1830—1831 гадоў, пасля чаго быў вымушаны эмігрыраваць у Францыю. З 1856 года жыў і працаваў на радзіме. Аўтар «Граматыкі музыкі» (1873 г.). Падарожнічаючы па Беларусі, Польшчы, Літве і Украіне, рабіў замалёўкі мясцін, звязаных з жыццём знакамітых людзей, і архітэктурных помнікаў, якія цяпер маюць вялікую каштоўнасць для гісторыі архітэктуры. Памёр у 1883 годзе.

**1847** год — нарадзіўся Томас Алва Эдысан, амерыканскі вынаходнік і прадпрымальнік. Аўтар больш чым ста адкрыццяў, галоўным чынам у розных галінах электратэхнікі: удасканаліў тэлеграф і тэлефон; вынайшаў фанограф; стварыў прамысловы ўзор лямпы напальвання і іншае. Па яго праекце пабудавана першая ў свеце электрастанцыя агульнага карыстання.

**1875** год — нарадзіўся (г. Вільня) Васіль Іванавіч Качалаў, расійскі акцёр, народны артыст СССР. Беларус па паходжанні. З 1900 года — у трупе МХАТа.



Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Сярод роляў: Трафімаў, Тузенбах («Вішнёвы сад», «Тры сястры» А. Чэхава), Чацкі («Гора ад розуму» А. Грыбаедава), Іван Карамазаў («Браты Карамазавы» паводле Ф. Дастаеўскага) і інш. Цікавіўся тэатральным жыццём Беларусі. Здымаўся ў кіно. Прысутнічаў на праглядзе народнай драмы «Цар Максімільян» Беларускай драматычнай студыі, якая працавала ў Маскве, і высока ацаніў творчасць для беларускага тэатра. Вітаў адкрыццё тэатраў у Віцебску і Гомелі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1948 годзе.

**1902** год — нарадзілася Любоў Пятроўна Арлова, выдатная савецкая актрыса, адна з першых зорак савецкага кіно, народная артыстка СССР. Здымалася ў фільмах «Вясёлыя рабяты», «Цырк», «Волга-Волга», «Вясна» і многіх іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памерла ў 1975 годзе.

### Было сказана

**Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:**
*«Самая страшная рэч — абыякавасць. Калі з ёй не змагацца, яна, як дрыгва, можа загубіць любога чалавека».*


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 615.
Нумар падпісаны ў 19.30 10 лютага 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12